ПРАЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

Віцебскі пралетары

КОШТ НУМАРУ Ў ГОРАДЗЕ І РАЁНАХ 5 КАП.

РЭДАКЦЫЯ: Палац працы, 3-ці паверх, пак. 39, 40, 41, 43. Тэлеф. агульны . 2-85, „ рэдактара 1-73, „ сакрат. і к-ры . . 72.

Падпісная цана ў месяц: Для рабочых, служачых і калгаснікаў . . — р. 80 к. Для устаноў . . . . . 1 „ — „ З дадаткам „Чырвоная Беларусь“: Для рабочых, служачых і калгаснікаў . . . 1 „ — „ Для устаноў . . . . . 1 „ 30 „

Плата за абвесткі: За радок кітыту . . . . . 30 кап. Для інвалідаў . . . . . 40 „ Пры шматразовым друкаванні скідка ад 30 да 50 проц.

ГОД ВЫДАНЬНЯ 14-ты.

ПАДЗЕННАЯ ГАЗЭТА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ. № 165 | Аўторак, 28 ліпеня 1931 г. | № 165

30 ліпеня, а 18 гадз., у Палацу працы, пакой № 11 склікаецца ПЛЕНУМ ГАРСАВЕТУ

На абвестцы дню:

1. Даклад аб становішчы камунальнай гаспадаркі гораду.
2. Даклад мандатнай камісіі.

Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў гарсавету абавязкова. Павінен таксама зьявіцца актыў гарсавету, вольны ў гэты час ад працы на вытворчасьці.

Абязьлічка і ўраўнілаўка — біч якасьці і прадукцыйнасьці працы

„ДЗЬВІНА“ І „СЬЦЯГ ІНДУСТРЫЯЛІЗАЦЫІ“ НІЯК НЕ РАШАЮЦЦА РАЗЬВІТАЦЦА З ГЭТЫМІ ВОРАГАМІ ВЫТВОРЧАСЬЦІ

„Ліквідаваць абязьлічку, палепшыць арганізацыю працы, правільна раставіць сілы на прадпрыемстве—такава задача“ (Сталін)

...а ўжо адмовіцца ад работы па-старынцы

...выкананьня прамфінпляны двух дзесяцідзёнак ...лейшых фабрыках гораду ...е, што рашучага эруху ...нце барацьбы за прамфін...ма. Нізавыя партыйныя, ...озныя і гаспадарчыя ар...ы яшчэ не пераключылі ...аботу па-новаму. Гаспа...разрахунак, які зьяўляец...й моцнай зброяй у ба...за колькасныя і якас...казальнікі, не знаходзіць ...шасьці нашых прадпры... фактычнага пералам... і далей папяровых рэ... многія прадпрыемствы ...лі. Больш таго, некато...падарнікі аказваюць су...еньне ў правядзеньні ...чага разрахунку. Так, ...отачнай фабрыцы, якая ...цэхаў, толькі адзін цэх ...ыкладу» пераведзен на ...рчы разрахунак. На за...е, чаму астатнія цэхі ...ь не пераводзяцца на ...рчы разрахунак, нават ...р парт'ячэйкі адказвае: ...раходзім у камбінат пра...сьцы і там пераводзём на ...рчы разрахунак цэхі». ...с недабачліва, па-апарту...у адносяцца некаторыя ...іраўнікі да такой важнай ...на-гаспадарчай справы. ...е прадпрыемства не мае ...к, якія канкрэтныя выні...той ці іншы цэх пасьля ...у на гаспадарчы разра... Унутрыцэхавая неразь...безадказная праца пра...ць сваё існаваньне.

...жо неаднаразова на ста... газэты адзначалі аб тым, ...ольшасьць нашых прад...тваў работае па-старын...аогул“, ня вывучаючы ...ы прарываў і вузкіх месц ...а ў паасобку вучастку, ...абрыгады. Такая буйная ...а, як «Сьцяг індустрыя...», яшчэ дагэтуль вядзе ...асных паказальнікаў па ...брыцы. Не жадае пераклю...аю штодзённую работу ...чэньне прычын хваробных ...аў кожнай групы, кож...бочага. Фабрыка ўвесь ...іць вялікі процант бра...цікавіцца, заняцца пы...т хто яго робіць, дзе ...а асноўная прычына— ...м кіраўнікі фабрыкі не ...ь ведаць. Пара ўжо ...ца ад фіксацыі лічбаў. ...перайсьці да такіх мэ...тадаў работы, каб кожны дзень заводакіраўніцтва ведала, хто ў яго прадпрыемстве робіць брак, ня выконвае пляновае заданьне і чаму, па якой прычыне. Толькі пры такой пастаноўцы магчыма адшукаць віноўніка нядбайнай і безадказнай працы, толькі пры такой пастаноўцы магчыма выявіць сапраўднага ўдарніка і ня мець такіх выпадкаў, калі гатовая прадукцыя, якая праходзіць праз усе цэхі, пападае к спажыўцу з бракам і дрэннай якасьці.

Адзін майстар цэху, адзін гаспадарнік ня можа поўнасьцю вырашыць гэта пытаньне. Тут значную ролю павінны адыграць нізавыя прафсаюзныя арганізацыі. Перабудаваўшы сваю працу па-новаму, прафсаюзныя ячэйкі павінны бліжэй падысьці да абслугоўваньня кожнага рабочага. Але мала зараз весьці толькі культурна-выхаваўчую работу. Трэба вывучыць склад рабочых, кожнага рабочага паасобку, хто больш дае браку, хто ня выконвае сваё заданьне—член саюзу ці не. Паставіць работу такім чынам, каб ахапіць усіх рабочых членствам. У гэтай галіне работы мы маем значны прабел. Размова старшыні фабкому фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» аб тым, што рабочыя не павінны ведаць колькі ў іх работае членаў саюзу—ёсьць на справе ігнараваньне пастаноў і дырэктыў ЦК партыі і ЎсеЦСПС. Прафсаюзныя ячэйкі на мясцох павінны штодзённа весьці ўлік складу рабочых, вывучаць прычыны прарываў, выяўляць сапраўдных ударнікаў вытворчасьці і мабілізоўваць масы вакол пытаньняў выкананьня і перавыкананьня пляновых заданьняў як па колькасных, так і па якасных паказальніках.

Першы месяц трэцяга рашаючага кварталу на ісходзе. Нельга далей цярпець такое становішча, калі прамфінплян ганебна ня выконваецца з-за нераспараджальнасьці, з-за безадказнасьці паасобных працаўнікоў прадпрыемстваў. Неабходзен рашучы пералом, неабходны тэрміновыя меры, каб поўнасьцю ліквідаваць абязьлічку, ўвесьці сапраўдны кантроль рублём у кожным цэху, у кожнай істужцы і брыгадзе.

...ікі процант браку і пераробкі— плады абязьлічкі

...ка «Сьцяг індустрыялі...за першыя 20 дзён ліпеня ...ны прарыў, пляновае за...выканана толькі на 88,6 проц. ...нік фабрыкі, спадзяючыся на ... не арганізоўвае масу рабо...зьнішчэньне недахопаў і .... Першы пінжачны цэх, ...дпачынку, увесь час ня вы...рамфінплян. 6-я бручная ...на ня выконвае прамфінплян ...больш пяці. У пінжачным і ...цэхах маецца шмат гато...абаў, але з прычыны дрэн...ьці работы склад іх ня пры...прыходзіцца перарабляць. ...зячы на тое, што на фаб...ла праведзена праверка сац...дарніцтва, што дало новы ...дарнікаў, з-за бязьдзейнась...рганізацыі гэтая ініцыятыва ...істоўваецца. Трэцяя зьмена ...ым цэху нікім не абслугоў...Быў выпадак, калі валасы ...ы папалі ў трансмісію і ня ...му аказаць ёй хуткую дапа... дзяжурны ўрач трэцюю ...е абслугоўвае.

Шыф.

...обкі, частая псота варшта...ікі процант браку—вось пла...ьлічкі, плады такой паста...боты, калі варштаты ня ма...ігго гаспадара і ня дзіва, што ...отаючы, вінаватага ў нядбай...ы трудна знайсьці.

Брак на фабрыцы ўлічваецца агульна па ўсёй фабрыцы. Колькі кожная істужка выпускае браку—гэта пытаньне нікога ня цікавіць. На маючыхся ў цэхах дошках паказваюцца толькі колькасныя лічбы выкананьня, вучот браку кожнага рабочага і нават брыгады не вядзецца. Ня зьнішчана і ўраўнілаўка. Рабочыя пінжачнага цэху атрымліваюць куды менш чым рабочыя бручнага цэху, хаця праца апошніх прасьцей. Сталоўка не прыстасавана да поўнага абслугоўваньня рабочых, разьлічана яна на 2500 рабочых, у той час, калі зараз маецца каля 4000. Якасьць абедаў дрэнная.

Наўм Абевгаўз.

Гаспадарчы разрахунак на фабрыцы яшчэ дагэтуль не праведзен у паасобных цэхах і знаходзіцца ў стадыі «праработкі». Фабком ніякай працы не вядзе. У яго рабоце ўсё «таемна». Так, на запытаньне работніцы, колькі фабрыка мае членаў саюзу, старшыня фабкому адказаў: «Гэта тайна. Прыходзілі вялікія людзі, але і яны атрымлівалі тамі самы адказ». Гэта ня вытрымліваючая ніякай крытыкі размова, ёсьць шкодная апартуністычная вылазка і па ёй трэба з усёй бальшавіцкай рашучасьцю ўдарыць. Фабком на справе нічога ня робіць і ня любіць крытыкі рабочых, якія паказваюць на яго бязьдзейнасьць.

Фейгіна.

...эхадміністрацыя за працай не наглядае

...страцыя і тэхнэрсанал аку...фабрыкі за працай рабо...эхах мала наглядаюць. Ра...рштатаў не правяраецца. Бы...выпадкі, калі для рамонту ...ў высылаюць сьлесараў, якія ...ць пачыніць іх. Ужо чатыры гады, як у шліфавальным цэху стаіць у бязьдзейнасьці халадзільнік, катлы якога, ўжо пакрыліся ржаўчынай.

Неабходна завастрыць увагу грамадзкасьці фабрыкі на поўнае выкарчоўваньне абязьлічкі.

Жахаў.

Брыдкасьці на ф-цы „Дзьвіна“ працягваюцца. Прарыў паглыбляецца

Першыя дні трэцяга рашаючага кварталу не даюць пералому ў выкананьні прамфінпляну фабрыкі «Дзьвіна». За 20 дзён ліпеня прамфінплян выканан колькасна на 76 проц. Нядбайная праца, безадказнасьць—галоўны біч фабрыкі. Абсталяваньне скарыстоўваецца толькі на 85 проц. Нежаданьне падрыхтаваць адпаведную кваліфікаваную сілу з рабочых фабрыкі, злоснае нежаданьне праводзіць ў жыцьцё рацыяналізатарскія мерапрыемствы—вось галоўныя прычыны няпоўнага і нерацыянальнага скарыстоўваньня абсталяваньня.

Ня гледзячы на тое, што на трэці квартал складзен прамфінплян, работа фабрыкі ідзе сясплянава. Штодзённа, а часам і па некалькі разоў у дзень мяняецца асартымэнт сыравіны і вырабаў.

Няма сапраўднага гаспадарчага разрахунку. Цэхі толькі на паперы лічацца гасразрахунковымі. Унутрацэхавая неразьбярыха, штучна стварае дэфіцыт цэхаў. Так, часальны цэх за 20 дзён ліпеня меў дэфіцыт 4000 руб. Заводакіраўніцтва няправільна аплачвае рабочым за выробляемую прадукцыю. Так, з прадзіва № 8 выходзіць прадукцыя № 12, а рабочым выплачваюць як за № 10. Прычым характэрным зьяўляецца той факт, што за межамі цэхаў гэтая прадукцыя лічыцца № 12. Гэта вядзе да паданьня інтэнсыўнасьці працы і к дэфіцыту цэхаў, якія знаходзяцца на гаспадарчым разрахунку. Майстры цэхаў недастаткова праяўляюць ініцыятыву ў барацьбе за эканомію, за зьнижэньне сабекошту.

На фабрыцы мае месца вялікая цякучасьць рабсілы. На працягу першага паўгодзьдзя ўшло з фабрыкі 986 рабочых, а прынята 791. Рацыяналізатарскія мерапрыемствы, прадугледжаныя па пляну (дыфэрэнцыяцыя працы ватэршчыц) у жыцьцё не праводзіцца. З прычыны гэтага мы маем такое становішча, што фабрыцы па пляну патрэбна 235 чал., а маецца 303 і ўсё-ж не хапае 70 чал. Мер к зьнішчэньню цякучасьці, за выключэньнем адміністрацыйных, ня прымаецца. «У нас няма абязьлічкі, але вялікія прагулы вымушаюць перакідваць ад адкага вартштату да другога»—так адказваюць кіраўнікі фабрыкі. Але што робіцца, каб зьнішчыць прагулы, каб скласьці рабочым адпаведныя ўмовы працы? Варштаты на паперы нібы маюць гаспадара, але на справе ўсё знаходзіцца ў брудным становішчы.

Мэтад ураўнілаўкі працягвае існаваць. На фабрыцы маецца дзьве камуны, усе члены якіх атрымліваюць аднолькавы заробак, пры неаднолькавай інтэнсыўнасьці працы. Падсобныя рабочыя атрымліваюць прыработак не з сваёй зьмены і цэху, а з агульнай выработкі ўсіх зьмен і вучасткаў работы. Больш кваліфікаваныя рабочыя, як банкаброшчыцы і матальшчыцы атрымліваюць менш чымся кардоўшчыцы і гекліншчыцы, кваліфікацыя якіх куды ніжэй. Ватэршчыцы атрымліваюць аднолькавую зарплату ад выработкі машыны. Існуючы тарыфны справачнік трэба здаць у архіў. У гэтай галіне ўжо прана некаторая пачата, пераглядаюцца нормы і расцэнкі па групах і цэхах.

Рабкор.

25-га ліпеня дырэктар фабрыкі не дапусьціў да работы 10 работніц, якія забыліся ўзяць з сабою пропускі. Просьбы работніц аб дапушчэньні іх да работы дырэктар не жадаў слухаць. «Ідзеце і прыносьце пропускі, тады я вас дапушчу да работы». Як вынік, мы маем той факт, што 10 работніц 25 ліпеня не работалі.

Вожык.

Газэта «Віцебскі пралетары» некалькі дзён таму назад пісала аб тым, што на фабрыцы «Дзьвіна» душацца рацыяналізатарскія прапановы рабочых. Арсэнал фактаў павялічваецца. Так, 19 ліпеня бюро рацыяналізацыі падало на імя дырэктара фабрыкі дакладную запіску аб немэтазгоднасьці вытвараемай з а р а з упакоўкі прадзіва ўручную і прапанавала перайсьці на мэханічную, г. зн. на мэтад, якім работала фабрыка раней. Замест таго, каб гэтую прапанову ажыцьцявіць, душыцель рабочых прапановы Балабуха дае галавацяпскую рэзалюцыю: «Заключэньне бюро рацыяналізацыі кіерна і выдумана». Грунтуючыся на гэтай бязглуздай рэзалюцыі, дырэктар фабрыкі накладвае другую рэзалюцыю: «Лічу няправільнай думку бюро рацыяналізацыі. У вагон грузіцца прадзіва у 6—7 тон. Трэба прыглядзецца лепш і адмяняць гэта ня трэба і не мэтазгодна». І гэта ў той час, калі зводка бухгальтэрыі за чэрвень месяц яскрава паказвае, ш т о ўсё прадзіва ў 188,3 тон пагружалася на справе па 6 тон. Калі-б перавесьці гэта на грошы і на лішнюю загружанасьць вагонаў, дык мы ўбачым наступнае. На агрузку 188,3 тон патрабавалася 29 вагонаў замест 23 пры мэханічнай пакоўцы. Гэта значыць, што шэсьць вагонаў прабеглі са ст. Віцебск да ст. Вязьнікі 901 клм. з-за нерацыянальнай пакоўкі. Агульны прабег пустых вагонаў толькі ў чэрвені месяцы складае 5406 клм., што дае страту па транспарту 604 р. 50 к., за нагрузку 60 р. і разгрузку 36 р., а разам каля 700 руб. Пры выпрацоўцы ў год 2500 тон прадзіва пры старым мэханічным спосабе, які ўжываўся да прыходу Балабухі, патрэбна было 300 вагонаў, а зараз пры ручной пакоўцы патрабуецца 375. Пры ручной п а к о ў ц ы пераплачваецца 4,2 кап. за кожныя 16 клг., у г о д гэта складае лічбу 6300 руб. і страта на рабсілу 1875 руб.

Мы лічым, што так нельга работаць. Глушыцелей рабочай ініцыятывы трэба прыцягнуць да суровай адказнасьці. Пара ўжо пакончыць з брыдкасьцямі, якія творацца на фабрыцы «Дзьвіна». Слова за РСІ і пракуратурай.

Брыгада.

Рабочыя прапановы на фабрыцы «Дзьвіна» ў жыцьцё не праводзяцца. На новых ватэрах ёсьць шмат цесных катушак, што не дае магчымасьці работніцам прадукцыйна работаць і што здбіваецца на якасьці іх работы. Катушкі часта цалком не наматваюцца і спадаюць з варштату ў грязь. Некаторыя работніцы цесныя катушкі выкідваюць вон. Работніцы некалькі разоў на вытворчай нарадзе высоўвалі прапановы аб тым, каб прасьвярліць у катушках большыя дзюркі, але гэтую прапанову ня хочуць ажыцьцяўляць.

Кручэк.

На 10-е ліпеня былі прызначаны тэхнічныя заняткі, лекцыі на якіх павінны былі чытаць Кац і Галубенка, але ня гледзячы на шэраг папярэджваньняў, апошнія не зьявіліся і заняткі былі сарваны. Неабходна завастрыць увагу прафсаюзнай арганізацыі фабрыкі на такое становішча з тэхвучобай і даць па заслугах тым, хто зрывае гэтую працу.

Рабкорка.

У месячнік штурму ліквідаваць прарыў

Фанэрны завод уступіў у трэці рашаючы квартал з значным прарывам у выкананьні прамфінпляну. Вытворчае заданьне па валавой прадукцыі выканана за паўгодзьдзе на 86,64 проц., па экспорту на 47,91 проц. Няўважлівасьць, нераспараджальнасьць, а ў некаторых мясцох безадказнасьць стварылі «аб'ектыўныя» прычыны, якія ўвесь час ганебна адбіваліся на выкананьні плянавага заданьня. Паравая машына з-за аварыі 30 проц. рабочага часу знаходзілася ў рамонце. Перавод заводу на сухую клейку з-за непадрыхтаванасьці ня даў належных вынікаў. Зношанасьць клеевых і сушыльных прэсаў і лушчыльных варштатаў стваралі частыя перабоі ў рабоце. Варштаты па чарве знаходзіліся ў рамонце (прэс па сухому клею прастаяў 18 зьмен, па мокраму—27 зьмен і г. д.). Адсутнічаў належны тэхнічны пэрсанал (не хапала інжынэра, майстра, мэханіка, бракера па разьдзелцы сыравіны). З пераходам завода на трохзьменную работу зараз адчуваецца недахоп рабочай сілы. Адсутнічае кіраўніцтва з боку трэста Лесбел. Нездавальняюча пастаўлена забесьпячэньне дапаможнымі і тэхнічнымі матар'яламі (лінейкі для лушчыльных варштатаў, тачыльныя калёны і бруські і інш.). Адсутнасьць масавай работы, слабае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, адсутнасьць цьвёрдага кіраўніцтва—усё гэта стварала тормазы, якія ганебна адбіліся на выкананьні прамфінпляну.

Першыя дні трэцяга рашаючага кварталу, хаця і даюць нязначны зрух (за 20 дзён ліпеня плян па валавой прадукцыі в ы к а н а н на 81,62 проц. і па экспарту — на 69,36 проц.), але гэта не гарантуе яшчэ пасьпяховае выкананьне праграмы.

Справаздачнасьць па заводу адстала на 5 месяцаў. Лічбаў аб зьнижэньні сабекошту яшчэ няма. Заводакіраўніцтва, дапусьціўшы такую вялікую адсталасьць у справаздачнасьці, толькі зараз узяло бухгальтэра і даручыла вытвараць яму работу «зьдзельна». З пераходам заводу ў веданьне фанэратрэсту, вытворчыя пляны пераглядаюцца і зьмяняюцца. У маючыхся папярэдніх плянах на 3-і і 4-ы кварталы ёсьць толькі колькасныя паказальнікі. Дэталёвых плянаў яшчэ няма. Прарыў першага паўгодзьдзя ў плян трэцяга кварталу ня ўключан. Сыравінай завод забясьпечан толькі да 1 студзеня. Захадлес і Лесбел ня выконваюць дагавароў па забясьпечаньні тэхнічнымі матар'яламі.

Ніводзін цэх дагэтуль на гаспадарчы разрахунак яшчэ не пераведзен. «Мы рыхтуемся да пераходу» — увесь час адказваюць з апартуністычным спакоем кіраўнікі заводу.

Прамова т. Сталіна, хаця на сходах рабочых і праработана, але к канкрэтнай практычнай рэалізацыі яшчэ ня прыступлена. Ня прымаецца належных мер да зьнішчэньня цякучасьці на заводзе. За першае паўгодзьдзе ўшло з заводу 409 чал., а прынята 390. Абязьлічка не ліквідавана, а знаходзіцца толькі ў парадку «тэхнічнай прапрацоўкі». Няправільная тарыфікацыя стварае ўраўнілаўку ў зарплаце. Маюцца выпадкі ў паасобных брыгадах, калі некваліфікаваны рабочы атрымлівае нараўне з кваліфікаваным (загрузка калод). Для палепшаньня бытавых умоў заводакіраўніцтвам будуецца інтэрнат на 140 рабочых.

У зьвязку з адозвай ЦК саюзу лесдраў і фанэратрэсту з 12 ліпеня на заводзе абвешчан месячнік штурму па ліквідацыі прарыву. Некаторы зрух у гэтай галіне маецца. Так, выкананьне вытворчых заданьняў па экспорту за першую пяцідзёнку ліпеня складала 50 проц., за другую 63,71, за трэцюю 58,28 і за 4-ю—97,36 проц.

На працягу месячніка завод павінен выйсьці з ганебнага прарыву. Першыя дні штурму паказваюць, што завод мае ўсе магчымасьці выкананьня плянавае заданьне. На заводзе маюцца энтузіясты сацыялістычнай працы, якія бяруць на буксір адстаючыя г р у п ы рабочых. Неабходна толькі трохкутніку заводу тэрмінова перабудаваць сваю працу і з бальшавіцкай настойлівасьцю замацаваць патрэбныя ўдарныя тэмпы для поўнага зьнішчэньня маючагася прарыву. Гаспадарчы разрахунак і плянавасьць—два асноўныя мерапрыемствы, якія трэба зараз-жа ажыцьцявіць.

Ш.

Чыё галавацяпства?

На складзе пабудовы Дзьвінскага мосту каля трох месяцаў валяецца пяць новых мэханізаваных плугоў заводу Растова-на-Дану. Як і для якой мэты яны папалі на пабудову мосту невядома і ніхто дагэтуль не паклапаціўся, каб высьветліць хто іх павінен атрымаць і здаць па належнасьці.

Хто зьяўляецца гаспадаром?

Крикадзільчык.

Рэарганізацыя камун павялічыла прадукцыйнасьць працы

На фабрыцы Лекерта доўгі час існавалі 50 камун. Ніхто ня ведаў, як яны работалі, арганізаваліся яны стыхійна. Калі пачалі правяраць работу камун, ці зьяўляюцца яны сапраўды вышэйшай формай сацыялістычнай працы, дык аказалася, што гэтыя камуны былі ўзорамі найгоршай работы. «Чаму гэта я павінен працаваць на другога. Чаму мне мець утрыманцаў. Я не хачу алімэнты плаціць» — вось як гаварылі члены камуны аб сваёй працы. Часта члены камуны, перавыканаўшы сваю норму, атрымлівалі нараўне з іншымі членамі, якія норму ня выканалі. Гэтая ўраўнілаўка прывяла к паданьню прадукцыйнасьці працы і нават працдысцыпліны. Была праведзена рэарганізацыя гэтых камун ва ўдарныя брыгады. На фабрыцы зараз работае 51 ударная брыгада, якія ахопліваюць амаль усіх рабочых фабрыкі. Рэарганізацыя камун ужо на першых кроках дала станоўчыя вынікі. Прадукцыйнасьць працы пачала падвышацца і дае ўжо 14,3 проц. На фабрыцы ўжо няма больш разговорчыкаў аб тым, „навошта мне работаць на другіх, бо ён атрымае стольні, сколькі і я, дык мне няма для чаго старацца“. Зараз ужо пастаноўка пытаньня зусім іншая. Калі ўраўнілаўка зьнішчана, дык няма на каго спадзявацца, а трэба работаць больш прадукцыйна і тады больш атрымаеш. Гэта ўзьняло настрой і сярод тых, якія раней ня выконвалі сваёй нормы і былі ўтрыманцамі ў другіх рабочых.

Адстаючыя групы рабочых з кожным днём падцягваюцца. Брыгады на абутковай фабрыцы Лекерта сябе апраўдалі.

Бейлінсон.

Мабілізаваліся на практычнае ажыцьцяўленьне прамовы т. Сталіна

Пастанова агульна-гарадзкога сходу тэхнічных работнікаў і гаспадарнікаў

Агульна-гарадзкі сход ІТР і адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу віцебскіх прадпрыемстваў, заслухаўшы даклад т. Судакова аб прамове т. Сталіна, абвяшчае сябе мабілізаваным на практычнае ажыцьцяўленьне прамовы. Кожны ІТР і адміністрацыйна-тэхнічны работнік бярэ на сябе абавязак актыўна ўдзельнічаць у прапрацоўцы прамовы т. Сталіна і выпрацаваць на грунце яе канкрэтныя мерапрыемствы, выходзячы з умоў даннага прадпрыемства, цэху і нізавога вытворчага вучастку, прыняўшы ўсе захады да безадкладнага практычнага ажыцьцяўленьня гэтых мерапрыемстваў.

На працягу адной дэкады кожны член ІТР і адміністрацыйна-тэхнічны работнік па свайму прадпрыемству абавязваецца давесьці на справее гаспадрчы разрахунак да кожнага брыгадзіра і варштату, перабудаваўшы сыстэму вучоту і справаздачнасьці, якая-б забясьпечыла сыстэматычны кантроль за выкананьнем умоў па гаспадарчаму разрахунку.

Прыступіць зараз жа да перагляду сыстэмы зарплаты з тым, каб цалкам зьнішчыць ураўнілаўку, укараняючы мэтад прагрэсыўна прэміяльнай зьдзельшчыны, забясьпечваючы падвышэньне зарплаты вядучым прафэсыям і больш кваліфікаваным рабочым.

ІТР, плянавікі-эканамісты, галоўныя бухгальтары, загадчыкі цэхамі павінны выкарчоўваць абязьлічку на вытворчасьці, выпраўляючы маючыяся паасобныя моманты ў практычным ажыцьцяўленьні бесьперапынкі, шляхам арганізацыі сталых зьмен, замацаваньня рабочых за адпаведнымі брыгадамі і варштатамі, падвышаючы пэрсанальную адказнасьць кожнага адміністрацыйна-тэхнічнага работніка за поўнае скарыстаньне і эфэктыўнасьць працы абсталяваньня. Кожны плянавік, галоўны бухгальтар адказвае за пастаноўку ўнутрывытворчага плянаваньня і сыстэматычнага давядзеньня якасных і колькасных паказальнікаў пляну да работы месца.

Паставіць у абавязак кожнага ІТР на вытворчасьці арганізаваць і сталa ўдзельнічаць у працы па аўладаньні рабочымі-ўдарнікамі тэхнікай вытворчасьці, забясьпечыўшы сыстэматычнае вылучэньне лепшых ударнікаў на кіруючую працу на вытворчасьці. Адначасова сход даручае гарпрафсавету і гарсавету пераглядзець склад ІТР ва ўстановах з мэтай прасоўваньня іх на вытворчасьць.

Справа рацыяналізацыі вытворчасьці, выкананьня рабочых прапаноў, разгортваньня вынаходзтва—павінна зьяўляцца асноўнай работай ІТР на вытворчасьці. Ніводнага прадпрыемства бяз пляну рацыяналізацыі, забясьпечваючы яго выкананьне праз стварэньне шырокага рабочага актыву вакол бюро рацыяналізацыі і ячэек вынаходзтва.

Пабудаваць працу ІТР на вытворчасьці на пачатках сацспаборніцтва і ўдарніцтва і кожны член ІТР павінен актыўна ўдзельнічаць у вытворчых нарадах, у арганізацыі вучоту эфэктыўнасьці сацспаборніцтва і ўдарніцтва, усяляка падтрымліваючы ўкараненьне новых сацыялістычных мэтадаў працы на вытворчасьці.

Для дапамогі прадпрыемствам у справе лепшай арганізацыі вытворчасьці, наладжваньня вучоту працы, дапамогі рацыяналізатарам і вынаходцам—арганізаваць пры гарпрафсавеце кансультацыйнае бюро ІТР і спэцыялістых.

У адказ на прамову тав. Сталіна агульна-гарадзкі сход ІТР абавязваецца аддаваць у грамадзкім парадку на менш 4-х гадзін у дэкаду на ўдзел у кансультацыйнай працы.

Даручыць гарпрафсавету, гарсавету і бюро МБІТ арганізаваць сыстэматычную праверку выкананьня гэтай пастановы на мясцох.

Прапанаваць ФЗМК і бюро ІТР на мясцох прапрацаваць у дэкадны тэрмін гэтую пастанову з удзелам рабочай грамадзкасьці.

Агульны сход лічыць мэтазгодным мець платнага працаўніка гарМБІТ'у. Усю працу гарМБІТ перанесьці ў нізавыя ячэйкі, выпрацаваўшы канкрэтны плян работы па кожнай галіне паасобна.

Няправільная сартыроўка і футаж далі страту ў 8101 руб.

У чэрвені месяцы з менскага заводу «Бальшавік» на фабрыку Лекерта прыбыла партыя хрому няправільнай сартыроўкі і няправільнага разьмеру футажу, з-за чаго замест эканоміі ў 496 мэтраў на суму 4495 руб., якія прадугледжаны па пляну, фабрыка атрымала праграй на 296 мэтраў, што выражаецца сумарна ў 3044 руб. Быў пасланы ў Менск прадстаўнік з экспанатам дрэннай сартыроўкі і няправільнага разьмеру футажу, на паездку якога выдаткавана 146 руб. Апрача гэтага, на перасартыроўку было ўплочана 415 руб., у выніку чаго фабрыка мела страту на гэтай партыі хрому 8101 руб. Белскураб'яднаньне склікала тэхвытворчую нараду, на якой пастанавіла, што каштоўнасьць няправільнай сартыроўкі хрому і нявернага разьмеру футажу аднесьці не за кошт завода «Бальшавік», а за кошт вытворчасьці, якая атрымала гэты хром.

У гэтую справу неабходна ўмяшацельства РСІ. Неабходна высьветліць віноўнікаў, якія сваёй нядбайнай працай далі фабрыцы страту ў 8000 руб. і прыцягнуць іх да адказнасьці.

Магергут.

У вінтавым цэху фабрыкі Лекерта ўжо каля 2-х месяцаў ляжаць 300 пар пачынак. На заўвазі рабочых Хацянаў адказвае: «у мяне няма людзей», у той час калі ў кожную зьмену 2 рабочых 8 гр разраду працуюць на рабоце меньшага разраду, а іх можна скарыстаць для паказанай працы.

Неабходна больш рацыянальна скарыстоўваць рабсілу, каб не ствараць залежы гатовай прадукцыі.

Рэконя.

Даслаць добраякасныя шасьцёркі

Выкананьне пляну па заводу «Чырвоны мэталіст» за апошнюю пяцідзёнку па бульбакапалках дае некаторы зрух. З 20 па 25 ліпеня праграма выкананa на 77,27 проц. Па днях гэта выразіцца ў наступным: 21 ліпеня выпушчана 7 бульбакапалак, 22—17, 23—21, 25 — 23 бульбакапалкі,—усяго за пяцідзёнку выпушчана 68 бульбакапалак пры заданьні ў 88 шт. Замест прысылкі добраякасных шасьцёрак завод Энгельса ў большасьці прысылае брак, які амаль ня прыгодны. Некаторыя пасьля паправы ідуць у ход, а некаторыя здаюцца ў Рудмэталгандль. Заводакіраўніцтвам пасланa на завод Энгельса спэцыяльная брыгада з тэхніка і 4-х рабочых, якія там самі будуць вытвараць адліў шасьцёрак. На заводзе слаба пастаўлена сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Рабочыя ня ведаюць, як яны выконваюць сацумову.

Грамадзкасьць гораду павінна дапамагчы заводу «Чырвоны мэталіст» выканаць свой плян па забясьпечаньні сацыялістычнай вёскі патрэбнымі ўборачнымі машынамі.

Шыф.

Унутраныя рэсурсы не скарыстоўваюцца

Мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў па абутковай фабрыцы імя Лекерта праходзіць недапушчальна нядбайнымі мэтадамі. З боку дырэкцыі фабрыкі няма належнай зацікаўленасьці і распараджальнасьці ў поўным выкарыстаньні ўсіх укутраных магчымасьцяй фабрыкі, а наглядаецца нават шкоднікае зьнішчэньне апошніх. Так, нядаўна падалі ў топку качагаркі тры цюкі з вялікімі абрэзкамі скуры, якія зьяўляюцца каштоўным матар'ялам для рантоў. Калі аб гэтым учынку паведамілі дырэктара т. Лемберга, дык апошні замест тэрміновага рэагаваньня напаў на тав. Мішуміса з крыкам: «што вы мне тут шукаеце. Я вам пенсію плачу і хоніць». Вось як нядбайна і безадказна адносіцца кіраўнік-гаспадарнік да справы мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў фабрыкі. На двор фабрыкі выкінута з цэху тры машыны, прыгодныя для вытворчасьці, сярод якіх маецца каблучны прэс, які зараз нельга дастаць. Ахова фабрыкі з пажарнага боку знаходзіцца ў нездавальняючых умовах. Так у кладовых вінтавога цэху знаходзіцца па 20 банак бэнзіну ў той час, калі па правілу забараняецца трымаць ня больш як 1—2 банкі.

Аб усіх гэтых фактах добра ведае трохкутнік фабрыкі, але ніякіх мер для зьнішчэньня гэтых брыдкасьцяй ня прымае. Такое становішча ні ў якім разе нельга цярпець. Неабходна ўмяшацельства ў гэтую справу РСІ і пракуратуры і вінаватых прыцягнуць да суровай адказнасьці. Справа мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і процапажарная ахова фабрыкі павінны быць на належнай вышыні.

Брыгада: **Скараходаў, Багары.**

Міжнароднаму чырвонаму дню—увага усіх грамадзкіх арганізацый

Кожнае прадпрыемства, кожны калгас, саўгас павінны быць апорнымі пунктамі абароны СССР

Усе сілы напружыць на завяршэньне пераможнага сацыялістычнага будаўніцтва.

Ні кроку ад генэральнае ленінскай лініі нашай партыі.

Быць гатовымі кожную гадзіну стаць на абарону сваёй сацыялістычнай бацькаўшчыны.

Умацняць сувязь пралетарыяту з Чырвонай арміяй.

Мабілізаваць усе прывадныя рэмні ад партыі да пралетарыяту, да ўсіх працоўных мас на службу па ўзмацненьні абароназдольнасьці краіны Саветаў.

— Вось баявая прысяга пралетарыяту і ўсіх працоўных мас Савецкага саюзу ў дзень 1-га жніўня.

1-е жніўня—міжнародны чырвоны дзень барацьбы супроць пагрозы новай вайны, дзень агляду баявой гатоўнасьці і пільнасьці пралетарыяту ўсяго сьвету.

Да гэтага часу антысавецкая вайна стаіць у парадку дня міжнароднага імпэрыялізму. Буржуазія ўсіх краін імкнецца знайсьці выхад з крызісу на шляхох усё больш жорсткай барацьбы супроць усіх атрадаў пралетарыяту сьвету, на шляху новай вайны супроць Савецкага саюзу. Усе тыя антысавецкія кампаніі, якія да апошняга часу зьмяняюць адна другую, сьведчаць аб тым, што **імпэрыялістыя супроць Савецкага саюзу гатовы ўжыць усякія сродкі.** Рад разаблачэньняў і правалаў шкодніцкіх контррэвалюцыйных арганізацый і падрыхтоўкі інтэрвэнцыі за апошнія гады прымусілі буржуазію перайсьці да новых мэтадаў у антысавецкай барацьбе. Зараз галоўнай стаўкай у гульні міжнароднага імпэрыялізму зьяўляецца стаўка на вялікую антысавецкую каліцыю. Сёньня, калі Савецкі саюз пераможна будуе сацыялізм, калі моц краіны саветаў з дня ў дзень вялізарна ўзрастае,—у такі момант для імпэрыялістых немагчыма пачаць вайну супроць СССР толькі пры дапамозе адных дробных васальных дзяржаў. Для барацьбы з краінай дыктатуры пралетарыяту, якую падтрымлівае пралетарыят усяго сьвету,—патрэбен саюз «вялікіх дзяржаў». Да гэтага і імкнецца зараз сусьветная буржуазія.

У дзень 1-га жніўня працоўныя СССР, разам з пралетарыятам усяго сьвету, праводзяць агляд сваёй гатоўнасьці да барацьбы з пагрозай вайны.

Савецкі саюз, які заўсёды імкнуўся і **заўсёды будзе імкнуцца толькі да міру,**—павінен быць гатоў да абароны ў разе нападу.

Выкананьне, датэрміновае выкананьне плянаў нашага сацыялістычнага будаўніцтва,—вось галоўны фактар магутнасьці, галоўны фактар абароназдольнасьці нашай краіны.

Выкананьне плянаў трэцяга рашаючага, ліквідацыя прарываў, якія яшчэ маюць месца, аўладаньне тэхнікай вытворчасьці, шчыльная сувязь з Чырвонай арміяй, дапамога ёй і чырвонаму паветранаму і марскому флётам,—вось тое, на што трэба асабліва зьвярнуць увагу працоўнаму Віцебску ў міжнародны чырвоны дзень.

У падрыхтоўцы да дню 1-га жніўня, у выкананьні пастаўленых перад намі гэтым днём задач **павінны прыняць актыўны практычны ўдзел усе грамадзкія арганізацыі, шырокія масы працоўных Віцебсну.** Наконт гэтага ёсьць зусім канкрэтныя рашэньні ЦК КП(б)Б і Віцебскага гаркому партыі, але-ж да гэтага часу грамадзкія арганізацыі Віцебску нічога не зрабілі, каб шырока разгарнуць работу па падрыхтоўцы да 1-га жніўня, каб мабілізаваць увагу шырокіх працоўных мас на гэтую справу.

Дзень 1-га жніўня павінен паслужыць моцным штурхачом да ўзмацненьня ролі і работы прафсаюзаў у справе абароны краіны. Віцебскі гарпрафсавет павінен стаць на чале гэтай работы, павінен дабіцца энэргічнай работы ў гэтым напрамку ад фабкомаў усіх прадпрыемстваў гораду.

Ленінскі камсамол, які мае вялізарнейшыя заслугі перад партыяй і саветамі, як у час грамадзянскай вайны, таксама і ў будаўніцтве сацыялізму,—у справе масавай вайсковай падрыхтоўкі, у справе ўцягненьня шырокіх мас працоўнай моладзі ў вайсковую і асоавіяхэмскую работу яшчэ мае вельмі мала дасягненьняў. Да дню 1-га жніўня ўсе камсамольцы Віцебску павінны практычна ўключыцца ў работу абаронную, у работу Асоавіяхэму, у вайсковую вучобу. **Рашэньні IX пленуму УсеЛКСМ павінны быць выкананы на 100 проц.** Ленінскі камсамол у справе практычнай работы па абароне краіны павінен быць заўсёды наперадзе, вядучы за сабою шырокія масы працоўнай моладзі. Пад лёзунгам узмацненьня абароназдольнасьці краіны камсамол павінен мабілізаваць яшчэ больш масы сваіх членаў і ўсю працоўную моладзь на выкананьне ва што-б то ні стала як колькасных, так і якасных паказальнікаў трэцяга рашаючага году пяцігодкі. Вялікай задачай камсамолу да 1-га жніўня зьяўляецца задача ўцягненьня піанэраў і ўсіх дзяцей працоўных у рады «юных прыхільнікаў Асоавіяхэму» і шырокае разгортваньне сярод іх вайсковай работы.

Усе грамадзкія арганізацыі, як **МОПР, Аўтадор, ОДР, «Чырвоны крыж», «Прэч няпісьменнасьць»,—павінны** таксама да дню 1-га жніўня **актыўна разгарнуць абаронную работу, кожная па сваёй галіне.** Усе ўмовы для гэтага кожная з гэтых арганізацый бязумоўна мае, але-ж да гэтага часу ніякай работы не вядзе.

«Асоавіяхэм—апора мірнай працы і абароны СССР»,—Асоавіяхэм адзін з прывадных рэмняй ад партыі да ўсіх працоўных, самае папулярнае дабрахвотнае таварыства Савецкага саюзу, якое налічвае ўжо каля 12 млн. членаў, а на Беларусі да 400 тыс. членаў,—Асоавіяхэм мае ў кампанію 1-га жніўня зусім асабліва вялізарнейшае значэньне.

Твар Асоавіяхэму ў гэтай кампаніі павінен адчувацца з асаблівай яскравасьцю. Усю сваю работу да гэтага дня асоавіяхэмарганізацыі павінны весьці такім чынам, каб максымальна завастрыць увагу сваіх членаў на выкананьне плянаў трэцяга рашаючага. Кожны асоавіяхэмавец—ударнік, кожны ўдарнік—член Асоавіяхэму—вось як павінны ставіць пытаньне ўсе асоавіяхэмарганізацыі. Неабходна дабіцца, каб кожны член Асоавіяхэму актыўна, напружана біўся за выкананьне прамфінпляну свайго прадпрыемства. Неабходна дабіцца стварэньня з членаў Асоавіяхэму ўдарных брыгад. Асоавіяхэм ня можа заставацца з боку ад такой вялікай справы, як уцягненьне працоўнай моладзі ў камсамол. Кожны малады асоавіяхэмавец павінен быць камсамольцам, але-ж і кожны камсамолец павінен быць актыўным членам Асоавіяхэму.

Пачатая 1-га мая праверка абаронай асоавіяхэмскай работы на прадпрыемствах павінна быць скончана да міжнароднага чырвонага дня. 1-га жніўня павінны быць падведзены вынікі гэтай праверкі. Вайсковая работа на прадпрыемствах і ўстановах і навучальных установах павінна быць пашырана і паглыблена, павінна быць пастаўлена на практычныя рэйкі, у яе павінны быць уцягнуты шырокія масы рабочых, асабліва рабочай моладзі.

«Асоавіяхэм — апора мірнай працы і абароны СССР», Віцебскі Асоавіяхэм павінен быць такім на справе.

М. Хаванскі.

Няхай ярка палаюць агні рэвалюцыйнага спаборніцтва

Да братоў па клясе і крыві—да рабочых і сялян Заходняй Беларусі

(З адозвы рабочых менскага чырвонасьцяжнага заводу „Бальшавік")

Мы рыхтуемся да 17-й гадавіны сусьветнай крывавай бойні. Драпежніцкія кюнцюры вашых прыгнятальнікаў ададралі ад нас жывы кусок нашага цела і плоці—Заходнюю Беларусь. Нас разьдзяляе калючы дрот кардону.

Але нас яднае братэрства клясы, нас яднаюць доўгія гады сумеснай барацьбы супроць кашмараў царызму і кароткія дні нашай агульнай барацьбы супроць вашых эксплёататараў у 1919 і 1920 г.г.

З напружанай увагай мы сочым за вашаю барацьбою. Мы бачым зарава вашых гэраічных боек, ня як пастаронньня гледачы і наглядальнікі. Ваша справа—наша родная кроўная справа. Мы, рабочыя і калгасьнікі Савецкай Беларусі, як і ўсяго Савецкага Саюзу—ваша ўдарная брыгада.

Пад ярмом польскіх імпэрыялістых корчыцца ў сударагах заняпаду ваша краіна. Ня дымяць фабрычныя трубы Беластоку, Гродны, Вільні і інш. гарадоў Заходняй Беларусі. Галадуюць беспрацоўныя, цягнуць мізэрнае існаваньне нешматлікія працуючыя, задыхаюцца пад ярмом безьзямельля і падаткаў селянін.

У гэраічным напружаньні цякуць нашыя будні. Вялізарнейшыя падзеі адбываюцца ў нас. Гэтыя падзеі робім мы, рабочыя, на чале з жалезнай кагортай бальшавікоў.

Гэты год у нас рашаючы. Мы заканчваем падвядзеньне фундаманту пад сацыялістычную эканоміку нашае краіны.

У вас зараз, як і ў нас калісьці, 10 гадзінны рабочы дзень—ня рэдкае зьявішча, а мы працуем па 7 гадзін у суткі, вось ужо некалькі год. У вас працуючыя мацеры пакідаюць сваіх дзяцей у брудзе і ў канавах на вуліцы, у нас працуюць ясьлі для ўсіх дзяцей работніц і калгасьніц. Работніца рука аб руку змагаецца за сацыялізм. Яна за роўную працу атрымлівае роўную плату. Яна роўны член працоўнай сям'і.

Гарачай пралетарскай справай мы дашчэнту разьбілі карканьне і праро́цтвы апартуністых і малавераў. Яны балбаталі аб неспадаючай крывой. Яны ў рыфму вашым здраднікам-меншавікам і іншай сволачы, якая спадцішку прадракала аб краху нашых плянаў. Няхай яны да нас прыдуць. Няхай вочы іх выедуць лічбы нашых перамог.

Дабіліся мы перамогі сацыялістычнай працай. Мы працуем, ведаючы тое, што працуем для сябе, для рабочай клясы, для сацыялізму. Наша праца—ня рабскі абавязак, ня праца прымусовая, як ваша.

Няхай ярка палаюць агні рэвалюцыйнага спаборніцтва паміж рабочымі і калгасьнікамі Савецкай Беларусі і рэвалюцыйнымі рабочымі і сялянамі акупаванай Заходняй Беларусі. Мы прапануем вам выбраць дэлегацыю, якая-б прыехала да нас і сваімі вачыма ўбачыла-б нашыя баявыя дасягненьні, якая ўбачыла-б і пабыла ў трансэях і акопах наступаючага сацыялізму. Няхай кожны рабочы, кожны працоўны селянін Зах. Беларусі ведае, як змагаецца яго цытадэль, яго бацькаўшчына—Савецкі Саюз і Савецкая Беларусь.

І мы выклікаем вас: у дзень 1-га жніўня няхай вуліцы гарадоў, мястэчак і вёсак Заходняй Беларусі ўбачаць вашыя баявыя выступленьні, зачырванеюць ад чырвоных сьцягаў камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, пад якімі вы выступіце супроць фашызму, супроць падрыхтоўваемага налёту імпэрыялістаў на краіну саветаў, за ваша сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне.

Прынята на агульных сходах рабочых чырвонасьцяжнага заводу «Бальшавік». Падпісана ўсімі рабочымі фыбрыкі.

У барацьбе супроць небясьпекі інтэрвэнцыі

Выкананьне «гістарычнай ролі» нападу на СССР па плянах францускa-ангельскіх імпэрыялістаў ускладзена на фашысцкую Польшчу, Румынію і Прыбалтыцкія краіны. Вось чаму іменна сумежныя з СССР буржуазныя дзяржавы шалёным тэмпам узбройваюцца, рыхтуюцца да ўзброенага нападу на Савецкі Саюз.

Пры дапамозе і пад непасрэдным кіраўніцтвам францускa-ангельскіх імпэрыялістаў створан цэлы рад ваенных канвэнцый, таямнічых дагавораў, накіраваных супроць краіны, якая будуе сацыялізм.

Зграя авантурыстаў-палкоўнікаў, якія ў сучасны момант зьяўляюцца галоўнымі прыказчыкамі польскага імпэрыялізму, нястрымана з надзвычайнай напружанасьцю сіл вядзе падрыхтоўку, як дыплёматычную, ваенную, так і гаспадарча-палітычную для нападу на Савецкі Саюз. Лягэр польскага фашызму ад адкрытых імпэрыялістаў да „пацыфістаў", ад банкіраў, фабрыкантаў, абшарнікаў да пэпэсаўцаў, „вызваленцаў"—шалёнымі тэмпамі, не пакладаючы рук, вядзе падрыхтоўку да інтэрвэнцыі.

ППС—гэтыя здраднікі, душы-целі рэвалюцыйнай барацьбы рабочых, выконваючы загад буржуазіі, імкнуцца падначаліць, уцягнуць рабочых у лягэр падрыхтоўкі інтэрвэнцыі. Распаўсюджваючы хлусьню аб «чырвоным імпэрыялізьме», ППС імкнецца адарваць рабочых ад клясавай барацьбы і прышчапіць ім патрыятызм, шавінізм. Зьвярыная ненавісьць да краіны саветаў, жах перад надыходзячай пралетарскай рэвалюцыяй аб'яднаюць увесь буржуазны лягэр у справе падрыхтоўкі вайны супроць СССР. Вось чаму з такім аднадушшам зацьвярджаюцца бюджэты ваеннаму міністру, якія паглынаюць большую палову ўсяго дзяржаўнага бюджэту.

Нацыянал-фашысты па той бок мяжы і контр-рэвалюцыйныя нацыянал-дэмакраты ў БССР, выконвалі і выконваюць ролю шпіёнаў, ролю агэнтаў міжнароднай буржуазіі ў падрыхтоўцы вайны супроць СССР.

Рэвалюцыйны пралетарыят усяго сьвету, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, вядучы барацьбу супроць дыктатуры буржуазіі, за дыктатуру пралетарыяту, паставіў сваім галоўным лёзунгам—лёзунг абароны СССР—бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету.

У дзень 1-га жніўня працоўныя ўсяго сьвету пад сьцягам камуністычнай партыі будуць дэманстрываць сваю непахісную волю, сваю баявую гатоўнасьць у любую гатоўнасьць, у любую хвіліну стаць у рады барацьбітоў, у рады абаронцаў сваёй бацькаўшчыны. Рукі прэч ад СССР!—З такім баявым лёзунгам выступяць працоўныя ўсяго сьвету. І калі буржуазія адважыцца напасьці на СССР, рабочая кляса і працоўныя эксплёатуемыя масы, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, ператвораць вайну імпэрыялістычную ў вайну грамадзянскую.

Л. Г.



Сацыял-дэмакратычная архітэктура

ЛЁЗУНГІ

ЦС Асоавіяхэму БССР да Міжнароднага чырвонага дню 1-га жніўня.

1. Буржуазія і фашызм рыхтуюць новыя войны, каб у крыві рабочых і сялян утапіць нарастаючую рэвалюцыю. Вайна вайне—будзе адказ працоўных ўсяго сьвету.

2. 1-е жніўня 1931 г.—мабілізацыя ўсіх пралетарскіх сіл на актыўную рэвалюцыйную барацьбу супроць небясьпекі новай вайны і абарону Савецкага Саюзу.

3. Наша палітыка—ёсьць палітыка міру. Гэту палітыку міру будзем весьці наперад усімі сіламі, усімі сродкамі (Сталін).

4. Няхай жыве Чырвоная армія—верны вартаўнік савецкіх межаў.

5. 2-гі інтэрнацыянал—прамы дапаможнік буржуазіі і фашызму ў справе падрыхтоўкі вайны супроць СССР. Наша праклёцьце сацыял-здраднікам

6. Толькі пад кіраўніцтвам Камінтэрну пралетарыят усяго сьвету пераможа.

7. За генэральную лінію УсеКП(б).

8. Індустрыялізацыя нашай краіны, калектывізацыя сельскае гаспадаркі—галоўны шлях ўзмацненьня абарона здольнасьці СССР.

9. Ударнае правядзеньне ўборачнай кампаніі, нарыхтовак і асеньняй сяўбы будзе нашым адказам на ваенныя махінацыі імпэрыялістых.

10. За суцэльную калектывізацыю БССР, за ліквідацыю кулацтва як клясы.

11. Ніводнага працоўнага Савецкага саюзу без аблігацыі пазыкі «3-га рашаючага году пяцігодкі».

12. Грамадзянскую авіацыю—на службу сацыялістычнага будаўніцтва. Даёш новыя пралетарскія кадры, добры аэрадром грамадзянскай авіацыі.

13. Дамо Чырвонай арміі стойкае, клясава-вытрыманае фізычна-здаровае папаўненьне.

14. Ніводнага няпісьменнага і мала пісьменнага прызыўніка 1909 г.

15. Павысім палітычную актыўнасьць Асоавіяхэму, шырэй разгорнем практычную яго дзейнасьць.

16. Уся ўвага Асоавіяхэму на самадзейнічаньне партыі і ураду ў выкананьні, перавыкананьні плянаў 3-га рашаючага году пяцігодкі.

17. Шырэй разгорнем сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва ў радох Асоавіяхэму.

18. СССР—ударная брыгада сусьветнага пралетарыяту.

19. Кожны асоавіяхімавец—ударнік, кожны ударнік—асоавіяхімавец.

20. Рабочы, калгасьнік, аўладаючы тэхнікай ў вытворчасьці, ты ўзмацняеш аснашчэньне Чырвонай арміі новай баявой тэхнікай.

21. Асоавіяхэмавец—ударнік на вытворчасьці і ўдарнік па вайсковай падрыхтоўцы.

22. На шалёны тэрор буржуазіі адкажам братэрскай дапамогай вязьням капіталізму.

23. Даёш 100 проц. піанэраў у рады юных прыхільнікаў Асоавіяхэму.

24. Ні на хвіліну не забудзем нашых палітзьняволеных братоў, якія змагаюцца з новымі ваеннымі аванturамі, з імпэрыялізмам і мілітарызмам.

25 Усе на барацьбу з белым тэрорам і фашызмам. Усе на дапамогу барацьбітом рэвалюцыі.

26 Супроць вялікадзяржаўнага шавінізму—галоўнай небясьпекі на данным этапе, супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму, які садзейнічае інтэрвэнцыяністым супроць яўрэйскага, польскага і іншых шавінізмаў. За цесную сувязь працоўных усіх нацыянальнасьцяй.

27. Узмацнім інтэрнацыянальную клясавую салідарнасьць. Падвоім рады МОПР'у.

Цэнтральны Савет Асоавіяхэму БССР.

Беспрацоўныя Нямеччыны галадаюць

На здымку: Беспрацоўная жанчына шукае ў мусарнай яме адкідны харчэй.

РАШУЧА ПЕРАБУДАВАЦЬ КУЛЬТМАСАВУЮ РАБО

ПРЫСТАСАВАЦЬ ЯЕ ДА ЧАРГОВЫХ ЗАДАЧ ПАРТЫІ І ЎРА

Усім гаркомам і райкомам КП(б)Б

Перадому ў рабоце па ліквідацыі прарыву ў культурным будаўніцтве дагэтуль няма. Тэрмінова мабілізуйце сілы і сродкі на выкананьне пляну культурнага будаўніцтва, асабліва па лініі ліквідацыі няпісьменнасьці, дашкольнага выхаваньня, школьнага будаўніцтва, перабудовы культмасавай работы, прыстасаваньня яе да чарговых задач партыі.

Забясьпечце разгортваньне бальшавіцкімі тэмпамі падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

Сакратар ЦК КП(б)Б **Гей.**

На шчотачнай фабрыцы зрываюць працу

Паміж штотачнай фабрыкай і Белпэдтэхнікумам маецца шэфская сувязь. У зьвязку з гэтым студэнты і бюро калектыву КСМ павінны там шырока разгарнуць культурна-выхаваўчую працу, і гэта праца там праводзіцца. Так, ад прафкому Белпэдтэхнікуму там працуе гурток „Бязбожнік", гурток па вывучэньні белмовы, а таксама праводзіцца палітгадзіна на ліквпункце. З боку камсамольскага калектыву вылучаны таварышы для падрыхтоўкі ў шэрагі камсамолу, і арганізаван палітгурток, але ўся гэта праца часта зрываецца з-за поўнай бязьдзейнасьці фабкому, які ня ідзе на дапамогу і бюракратычна адносіцца да гэтай справы.

Імкненьне студэнтаў выканаць на 100 проц. сацумову сыстэматычна зрываецца з-за дрэнных адносін да гэтай справы сэкратара калектыву шчотачнай фабрыкі Тэва. Так ім 3 разы былі сарваны заняткі палітгуртка, з-за таго, што ён не абвясьціў камсамольцам аб занятках.

Трэба зараз-жа спыніць гэтыя галавацяпскія і брыдкія адносіны і стварыць сапраўдныя ўмовы для разгортваньня культвыхаваўчай працы. **Шарко А.**

Набыць неабходную колькасьць нацменаўскай літаратуры

Праводзячы агляд працы бібліятэкі клюбу мэталістых, брыгада, вылучаная саюзам працасьветы, на раду з маючыміся дасягненьнямі ў рабоце бібліятэкі, высьвятліла таксама і рад недахопаў. Да ліку дасягненьняў бязумоўна трэба аднесьці тое, што бібліятэка як у сябе, а таксама і праз перасоўкі на прадпрадпрыемствах абслугоўвае каля 2000 рабочых. Маецца сувязь паміж бібліятэкай і прадпрыемствамі, а таксама добра прасоўваецца ў гушчы рабочых тэхнічная літаратура. Бібліятэкай на прадпрыемствах зроблены выстаўкі кніг.

Адным з самых буйных недахопаў зьяўляецца тое, што адсутнічае дастатковая колькасьць кніг наогул і асабліва на мовах нацменшасьцяў, пры чым апошняя літаратура недастаткова прасоўваецца ў масы.

Трэба зараз-жа выжыць гэты вялікі недахоп. Адпаведныя арганізацыі павінны прыняць усе меры к таму, каб забясьпечыць бібліятэку адпаведнай колькасьцю літаратуры на мовах нацменшасьцяў і дабіцца хутчэйшага прасоўваньня яе ў масы.

Пэўзьнер і Багатырова.

Культпраца вядзецца

На фанэрным заводзе, д ботае каля 600 рабоч якай культурна-масавай ваўчай работы не вя Клюб скарыстоўваецца в на пад сталоўку. Выпіс газэты рабочыя не чы Бібліятэка заводу зус працуе і заўседы знахо пад замком. Фабком ня ўдарніцтвам. За апошн прагулы павялічыліся. В чая дысцыпліна пала.

Адпаведныя арганізацы вінны прыняць меры для шчэньня гэтых непарад паставіць культурна-м працу на заводзе на нал вышыню.

13 культработнік якія... не працуюц

У сампрамсаюзе ёсь культурных работнікаў, н маньне якіх штомесячна коўваецца 1560 руб., а рысьці ад іх ніякай няма. праца не вядзецца.

Трэба адмовіцца ад утр ня такога штату работ перайсьці на дабрахвотн

Слова за гарпрафсавет

Ла

На ф-цы „Сьцяг стрыялізацыі" аб лі цыі няпісьменнасьці турбуюцца

На фабрыцы **«Сьцяг стрыялізацыі»** вельмі дрэн стаўлена праца па ліквід няпісьменнасьці. Няма п вучоту, між тым у шэрага пісьменных маюцца і пр нікі.

Неабходна фабкому ў новым парадку ўзяцца за дацыю няпісьменнасьці сяр бочых і ў першую чаргу дапрызыўнікаў. **Мільго**

Неабходна дэталёва высьветліць справу

Пралетстуд адпусьціў для аздараўленьня студэнцтва пэдагагічна-індустрыяльнага рабфаку 500 руб., але гэтыя грошы не пайшлі па памянёнаму прызначэньню. Групы, якія зімой канчаюць рабфак, сабраліся ехаць на экскурсію, але да гэтага няма адпаведнай колькасьці грошай і таму рашылі скласьці «фонд», у які і ўключылі грошы, адпушчаныя на аздараўленьне студэнтаў.

Цікава адзначыць як гэта было праведзена на агульным сходзе. Было аб'яўлена, што месц у дом адпачынку ўсё роўна не дадуць, і таму моў за гэтыя грошы трэба закупіць курортныя месцы. Пры такой пастаноўцы пытаньня гэтая прапанова прайшла пры 26 за і 24 супроць. Між тым грошы на курортныя месцы маюцца асобна, гэтыя-ж 500 рублёў перададны для экскурсіі, а студэнты як чакалі адпачынку, так і чакаюць да гэтага часу. Трэба гэта пытаньне дэталёва высьветліць. Студэнт.

Спыніць брыдкасьці ў рабоце польскага клюб

Дагэтуль польскі клюб наогул існаваў для таго, каб абслугоўваць працоўных палякаў г. Віцебску, але зараз справа абстаіць зусім інакш. Клюб фактычна зрабіўся кватэрай яго загадчыка **Валожына,** які выкарыстоўвае для сябе ўсё, што маецца ў клюбе, пачынаючы ад раяля і канчаючы лёзунгамі. Ні чытальня, ні гурткі не працуюць.

Праца сярод працоўных палякаў ніякая не вядзецца, днямі клюб закрыты на замок. Калі піанэры і вучні спрабавалі прывесьці клюб у належны парадак, дык Валожын іх дапамогу адхіліў. Вызначаныя ў чыт дзяжурныя ня раз па стаялі перад закрытымі д рыма, чакаючы загадчыка.

У выніку такіх адносін з чыка вучні зусім перастал кавіцца працай клюбу. С адпускаемыя на клюб, на магчыма было-б абстал чытальню, сцэну і розныя кі, належным чынам не вы стоўваюцца.

Трэба тэрмінова спыніць і брыдкія адносіны загадчыка ложына да справы абслугоў ня працоўных палякаў Віце

Рабо

Упарадкаваць гарадзкі сад

Месц для адпачынку ў горадзе наогул вельмі мала, а адсюль выцякае неабходнасьць добра ахоўваць і максымальна скарыстоўваць належным чынам маючыяся ў нас сады.

Сад імя Леніна, які належыць саюзу швэйнікаў, належным чынам не ўпарадкаван, дарожкі не ачышчаны і пачынаюць зарастаць дзікімі травамі. Яшчэ горш тое, што не захоўва расьліны розных відаў, якія маюцца. Аб гэтым яскрава жуць сухія сучы, што адзі чакаюць свайго ўпарадкава

Трэба адпаведным арга цыям паклапаціцца аб упара ваньні саду, каб перат яго ў сапраўднае месца а чынку.

Г. С. Камінс

ПАДВЫСІЦЬ РАБОЧЫ КАНТРОЛЬ НАД ДЗЯРЖАПАРАТАМ

Вопыт работы газэты «Рабочы» па пытаньні перабудовы шэфскай работы над саўапаратам павінен быць падхоплен усімі прафсаюзнымі арганізацыямі з такім разьлікам, каб дарэктывы апошняга пленуму ЦК УсеКП(б) па пытаньні шэфскай работы над дзяржапаратам, барацьба з бюракратызмам сталі дастаяньнем усіх рабочых мас, усёй грамадзкасьці Віцебшчыны.

Да апошняга часу партыйныя дырэктывы па шэфству над саўапаратам ня ўвяныты яшчэ на належную вышыню партыйнымі я-эйкамі, камсамолам і прафсаюзам. Праведзены ў сакавіку месяцы агляд работы па шэфству над установамі пад непасрэдным кіраўніцтвам РСІ у той час даў некаторую зарадку: было вылучана звыш 350 рабочых для практычнай работы па шэфству над саўапаратам, абралі шэраг сацыялістычных намесьнікаў і інспэктараў з рабочых буйнейшых прадпрыемстваў, але гэтая хваля рабочай актыўнасьці ня была замацавана прафсаюзамі і іншымі арганізацыямі, а зьявілася камсанейскай успышкай рабочага кантролю над саўапаратам. Між іншым паасобныя брыгады рабочых, абраныя на вытворчасьці, далі вельмі добрыя прыклады, як трэба працаваць. Рабочыя шчацінной фабрыкі аказалі вялікую дапамогу дзяржбанку ў рэалізацыі пазыкі «Трэцяга рашаючага году», рабочыя махорачнай фабрыкі выкрылі ў сваёй падшэфнай установе (Белдзяржснаб) дрэннае разьмеркаваньне тавараў, самазабесьпячэньне і г. д.

Аднак, добрыя прыклады работы шэфскіх рабочых брыгад ня былі падхоплены ўсімі грамадзкімі арганізацыямі з-за адсутнасьці жывога апэрацыйнага кіраўніцтва з боку грамадзкіх арганізацый, а таксама з-за апартуністычнай недаацэнкі шэфскай работы з боку загадчыкаў падшэфных устаноў, якія займаліся толькі разважаньнямі аб тым, што шэфы не дапамагаюць працаваць. Гэта работа ня ўзьнята на належную вышыню.

Мы маем яўнае скажэньне партыйных дырэктыў з боку дырэктара падшэфных саўгасаў, прыгарадных гаспадарак у тым, што сацнамесьнікі, вылучаныя прадпрыемствамі, скарыстоўваюцца як тэхнічныя працаўнікі па вярбоўцы рабсілы на праполку і ўборку ўраджаю. Па шэрагу ўстаноў уся работа па шэфству абмяжоўваецца папяровымі ўмовамі паміж установамі і прадпрыемствамі, бяз шырокага рабочага кантролю дзейнасьці саўапарату.

Якім чынам павінна быць перабудавана шэфская работа над саўапаратам?

Праводзячы шырокую прапрацоўку пастаноў пленуму ЦКК УсеКП(б) нам неабходна ўзьняць шырокую грамадзкасьць вакол перабудовы шэфскай работы над савецкім апаратам. Нам патрэбна дабіцца сапраўднага рабоч. кантролю, сапраўднай штодзённай барацьбы з бюракратызмам і цеганінай, барацьбы за аздараўленьне савецкага апарату шляхам ачысткі яго ад шкодніцкіх элемэнтаў. Прафсаюзы, разам з РСІ, абавязаны стаць на чале ўздыму рабочай ініцыятывы ў барацьбе з канкрэтнымі носьбітамі зла шляхам ажыцьцяўленьня прамовы т. Сталіна аб новых умовах работы, арганізаваць сацспаборніцтва і ўдарніцтва на лепшую работу ўсіх галін савецкага апарату, узьняць на палітычную вышыню работу сацыялістычных намесьнікаў, правільна скарыстаць кожнага брыгадзіра, працуючага па шэфству. Трэба таксама зьні шчыць тую вялікую блытаніну, якая існуе ў арганізацыйных формах шэфства.

На Усебеларускай нарадзе ЦСПСБ, адбыўшайся 23 га л г. г., частка таварышоў рабілі бы зблытаць рабочае шэфства вёскай з задачамі шэфства над апаратам. Гэтая блытан лішні раз падкрэсьліў тое, што шэфская работа знахо ца на задворках. Мы лічым, нельга зараз абмежавацца то стварэньнем шэфскіх камісій па в ству над савецкім апаратам. Н ходна дабіцца таго, каб кож сацсумяшчальніка, кожнага да хвотніка інспэктара выбіралі н срэдна на вытворчасьці, навуч дапамагаючы яму, як узяцца за п тычную работу, даць мэтавае зад не работы ва ўстанове і самае лоўнае, каб аб яго рабоце і ст вішчы перабудовы работы савец апарату—падшэфнай установы даў увесь рабочы калектыў і толькі ведаў, а вёў бы рашучую рацьбу за аздараўленьне савец апарату.

Дэпутацкія групы на вытворча павінны стаць баявымі штабамі, кол якіх будзе стварацца рабочы тыў, будуць зьбірацца прапаг рабочых па вытворчасьці, якім нам палепшыць матарыяльныя і тавыя ўмовы рабочых, якім чы вытруціць «нэпманскі дух» з ка рацыйнага апарату і як перабу ваць усю работу саўапарату ў паведнасьці з новымі ўмовамі і дачамі. Трэба дабіцца таго, ж кожны наш крок, каб новыя мэт шэфскай работы як мага хутчэй с лі дастаяньнем усіх прадпрыемст і ўстаноў. Трэба моцна ўдарыць апартуністычных самацёчных н троях, якія пануюць у шэрагу п арганізацый у адносінах да рабо га кантролю, да практычнай рабо па шэфству.

М. Разумаў

Правяраем разгортваньне ўборкі.

Скарыстаць месячнік генэральнай праверкі для поўнага ўнядрэньня зьдзельшчыны, ліквідацыі абязьлічкі, давядзеньня плянаў уборкі да кожнага калгасьніка

Толькі ў працаднёх

Пашуча біць па малейшых спробах ігнараваць зьдзельшчыну па кулацкіх настроях

«Усе бяз выключэньня работы ў калгасах павінны быць арганізаваны на асновах зьдзельшчыны з тым, каб самыя формы зьдзельшчыны былі найбольш простымі і зразумелымі кожнаму калгасьніку і прылічваючаяся калгасьніку колькасьць працадзён магла быць запісана ў яго працоўную кніжку без складаных разьлікаў з вучотам пры гэтым ня толькі колькасьці праробленай работы, але і яе якасьці».

(З рэзалюцыі пленуму ЦК УсеКП(б) ад 12 га чэрвеня 1931 г.).

...едаацэнка значэньня клясавай барацьбы ў мінулую ўборачную кампанію прыводзіла часта да сур'ёзных вынікаў. У гэтым годзе ўборка ...рабуе яшчэ большай клясавай насьці, бо ў зьвязку з посьпехамі калектывізацыі кулак будзе дзейнічаць з яшчэ большым азлабленьнем.

...кулацкае шкодніцтва павінна быць ...ералізавана шырокай масавай работай і галоўным чынам, найбольшым ростам зацікаўленасьці калгасьніка ў рабоце. А зацікаўленасьць калгасьнікаў дасягаецца такой арганізацыяй працы, калі кожны калгасьнік ведае, што ён атрымае, тым больш, чым больш ён будзе працаваць, г. зн. **арганізацыяй працы на ставе зьдзельшчыны.**

...прынятая VI зьездам саветаў пакова, па якой «хто больш і лепш працуе, той больш атрымлівае, хто горш працуе, той нічога не атрымлівае», павінна стаць асновай разьмеркаваньня прыбыткаў у калгасе, пакуль быць усвоена і ўсьвядомлена ...ным калгасьнікам. Паядоцкае разьмеркаваньне прыбытку павінна быць рашуча адкінута. Большасьцю калгасаў яно ўжо адкінута. VI зьезд ...етаў расцаніў паядоцкае разьмеркаваньне прыбытку, як асноўны неп калектывізацыі ў 1930 г.

«Галоўнейшымі і самымі шкоднымі недахопамі ў рабоце калгасаў у 1930 г. былі—кажа пастанова зьезду,—па-першае, разьмеркаваньне калгаснага прыбытку не па колькасьці і якасьці працы калгасьнікаў, а па душах і па-другое, ...яўмелая і дрэнная арганізацыя працы, у асаблівасьці па ўборцы ...ураджаю».

...ле і зараз яшчэ знаходзяцца ...абаронцы паядоцкага разьмеркаваньня прыбыткаў. Абараняць ...дкае разьмеркаваньне прыбыткаў ...ць толькі кулак і падкулачнікі, ...партыяй і ўрадам яно прызнана ...ыемлемым.

...зараз асноўнымі зьвеньнямі работы ...калгасах зьяўляюцца: 1) рабочы ..., 2) зьдзельшчына і 3) ліквідацыя ...ьлічкі. Па ўсіх відах работы па...а быць праведзена прымацаваньне ...сталага складу работнікаў да ...тараў, коняй, машын і г. д. ...ельшчына-галоўнае зьвяно ўсяго ...цугу работы калгасаў.

...глядзіма, якое становішча зай...зьдзельшчына ў нас на Віцебшчыне. Атрыманыя зьвёсткі ад вы...шых у калгасы брыгад рахунко-працаўнікоў і брыгад ад прадпрыемстваў сыгналізуюць аб вельмі ...ожным становішчы ў гэтым ...рамку.

Мы маем з боку некаторых кіраўнікоў і арганізацый калгасаў поўнае непаразуменьне і палітычную недаацэнку гэтага важнага мерапрыемства ў рабоце калгасаў. У некаторых калгасах зьдзельшчына ўведзена фармальна, у другіх калгасах кіраўнікі наогул арганізацыі палец аб палец ня ўдарылі да гэтага часу ў галіне правядзеньня зьдзельшчыны (калгасы «Чырвоны ўсход», «Чырвоная слабада», Міхалёўскага сельсавету) і шмат іншых. Ня лепшае становішча і ў галіне пастаноўкі вучоту ў калгасах.

Больш таго, мы маем прыклады варожых адносін да зьдзельшчыны, з боку кулацкіх падпявал. Зьмяшчаемая ніжэй даведка, выдадзеная рахунковаму працаўніку, накіраванаму ў калгас для наладжваньня вучоту, старшынёй праўленьня калгасу імя т. Сталіна, Сялюцкага с. с., Красновічам, зьяўляецца яскравым паказальнікам гэтага.

> **«Дадзена гэткая гр. Карагінай М. С. у тым, што калгас Сталіна на зьдзельшчыну не перайшоў і што ў сучасны момант перайсьці на зьдзельшчыну ні ў якім разе ня можа пры недахопе рабочых рук, а пагэтаму памянёнай т. Карагінай правесьці зьдзельшчыну немагчыма ў калгасе Сталіна, што і сьведчыцца. Старшыня праўленьня Красновіч».**

Далей гэтага прыкладу ісьці ня трэба. Зразумела, што кулацкі агэнт Красновіч ня можа і не павінен быць кіраўніком калгасу.

Райкалгассаюз да гэтага часу зусім не паклапаціўся мець хоць-бы папярэднія вынікі пераходу калгасаў на зьдзельшчыну. Па яго думцы «на шыпцы ўсё спакойна».

Зараз мы павінны паставіць гэта пытаньне толькі такім чынам, што поўнае правядзеньне зьдзельшчыны, якое забясьпечвае ўдарныя тэмпы работы, адэнкай усіх работ у працадзёнах, штодзённым вучотам работы калгасьнікаў і запісамі ў кніжцы выпрацаваных ім працадзён ня менш аднаго разу ў пяцідзёнку,—забясьпечыць посьпехі калгаснага будаўніцтва.

Трэба рашуча ўдарыць па апартуністычных адносінах да правядзеньня зьдзельшчыны ў калгасах, як галоўнай небясьпецы на фронце разгортваючагася са значнымі посьпехамі калгаснага будаўніцтва, па настроях такіх «кіраўнікоў», як Красновіч.

Месячнік генэральнай праверкі разгортваньня ўборкі—павінен зьвяціцца тым штурхачом, які зьнішчыць усе недахопы і ліквідуе прарывы ў правядзеньні зьдзельшчыны. **В.**

42,4% бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР у калгасах

20 раёнаў калектывізавана звыш 50 проц.

Паводле зводкі НКЗБ на 20-га ліпеня ў калгасы БССР аб'яднаны 328.102 гаспадаркі, або 42,4 проц. усіх гаспадарак. 20 раёнаў дабіліся калектывізацыі звыш 50 проц. Вось гэтыя раёны: Аршанскі, які калектывізаван на 55,3 проц., Багушэўскі—58,1 проц., Бягомльскі—74 проц., Ветрынскі—54,6 проц., Высачанскі—53,1 проц., Горацкі—54 проц., Касьцюковіцкі—71,2 проц., Копыскі—74,3 проц., Койданаўскі—93 проц., Круглянскі—73,8 проц., Крычаўскі—60,7 проц., Лепельскі—84 проц., Межынскі—64,3 проц., Менскі—66,2 проц., Мсьціслаўскі—69,7 проц., Сіроцінскі—64 проц., Талачынскі—57,4 проц., Хоцімскі—75,8%., Чэрыкаўскі—62 проц., Клімавіцкі—76 проц.

Толькі адзін Капаткевіцкі раён калектывізаваны менш як на 20 проц., па якім лічыцца 18,7 проц. гаспадарак у калгасах.

У калгасе „Бярозa" пануе падзёншчына

Тэрмінова ўключыцца ў месячнік праверкі разгортваньня ўборкі

21-га ліпеня ў падшэфны В.-Лётчанскі сельсавет выехала брыгада з лесзаводу № 13 у складзе 17 чал. разыкновых работнікаў у дапамогу арганізаваным калгасам наладзіць дасканалы вучот.

Праца праводзілася па 4-х калгасах асобнымі брыгадамі, якія выявілі: Калгас «Зара», нягледзячы на тое, што ён новы і ахапіў усяго 12 гаспадарак, на сёньняшні дзень актыўна скалачвае сваю калектыўную гаспадарку, замацоўваючы посьпехі. Брыгада наладзіла вучот, завяла патрэбныя кнігі і дала накіраваньне ў далейшай працы.

Калгас «Молат» аб'яднае 32 гаспадаркі, у ім сканцэнтравана значная маёмасьць і маюцца ўсе падставы к тому, каб у бліжэйшы час калгас стаў адным з перадавых па раёну.

Зусім інакшы малюнак спаткала брыгада ў калгасе «Бяроза». Гэты калгас існуе з 1918 году (былая камуна), аб'яднае каля 150 гаспадарак, мае аддзяленьні і г. д., але кіраўніцтва гэтага калгасу зусім не адпавядае свайму прызначэньню, няма гаспадарчага вока, пануе поўная безгаспадарчасьць у рахунковай частцы. Маецца рахункавод, які нічога не зрабіў, акрамя блытаніны.

Да гэтага часу невядома, хто працуе ў калгасе (адсутнічае імянны сьпіс), не заведзен вучот працадзён. Назіраюцца выпадкі, калі калгасьнік, які працуе ўвесь час, ня мае ніводнага працадня і ўсе лічбы бяруцца са столі, у выніку чаго маецца шэраг скаргаў з боку калгасьнікаў. Адсутнасьць першапачатковых дакумантаў не дала магчымасьці брыгадзе наладзіць дасканальна запіс вучоту працадзён, выдаткаў, прыбыткаў і г. д.

Такое становішча патрабуе тэрміновага перагляду ўсёй працы па вучоту.

Лесзавод, як шэф, павінен дапамагчы калгасу выйсьці з гэтага становішча.

Усім арганізацыям калгасу неабходна безадкладна ўключыцца ў месячнік генэральнай праверкі працы калгасу, выйсьці з паласы прарываў і з бальшавіцкай упартасьцю выканаць і перавыканаць пляны.

Уя. А.

З 145 га скошана 70

Ганьба прагульшчыкам і лодырам

У калгасе імя **Войнава**, Рудніцкага сельсавету, на сходзе калгасьнікаў з інфармацыі старшыні калгасу аб ходзе ўборкі канюшыны і сена высьветлілася, што з 45 га канюшыны скошана 43, убрана 35, з 145 га лугоў скошана 70 га і ўбрана 60 га. Калгасьнікі актыўна адзначалі ў спрэчках ўсе недахопы, якія перашкаджаюць ходу ўборкі сена. Прагульшчыкам і зрыўшчыкам уборкі сенажаці калгасьнікам: **Вашкову Ніфёдару, Мітковічу Ягору, Клявіну Карлу і Вараб'ёву Якубу** агульны сход вынес грамадзкае ганьбаваньне.

Калгасьнікі адзначылі, што дрэнна абстаіць справа з падлікам працадзён калгасьнікам. Працадні не падлічаны і ў кніжкі калгасьнікаў не занесены.

Брыгада па сіласаваньні ня поўнасьцю ўключылася ў выкананьне і перавыкананьне заданьняў па сіласаваньні кармоў. На сёньняшні дзень падрыхтавана толькі 5 ям, а засіласавана ўсяго 2 ямы, што складае каля 10 тон сілосу.

Трэба ў месячнік генэральнай праверкі працы калгасаў пакласьці канец гэтым марудным тэмпам працы, каб па бальшавіцку выканаць і перавыканаць пляны ўборачнай кампаніі і сіласаваньня. Мэтадамі працы калгасьнікаў павінна стаць шырокае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Прагульшчыкам і зрыўшчыкам уборачнай кампаніі трэба даць рашучы адпор.

Брыгадзір **Пытлямоў.**

Аб сіласе нават і не гавораць

Па калгасу «1 мая», Старасельскага сельсавету, пляны сіласаваньня правалены. У той момант, калі мы ўжо даўно павінны пачаць сіласаваньне, на сёньня яшчэ сіласная вежа стаіць не адрамантавана. Аб сілосных ямах нават няма і размовы. Камсамольцы, якія былі на курсах сіласаваньня, не жадаюць працаваць у гэтай галіне і лепш займаюцца гульнямі па Стараму сялу. Бюро калектыву КСМ гэтым пытаньнем зусім ня цікавіцца.

Такое становішча надалей зусім нецярпіма. Пляны сіласаваньня павінны быць выкананы поўнасьцю. Адказнасьць за гэтую справу ў першую чаргу панясе праўленьне калгасу. Трэба ў час правядзеньня месячніку генэральнай праверкі працы калгасаў ударыць па гэтай сьпячцы.

Бюро брыгада:

Пламенны і Прамень.

Муна „Прагрэс", паказваючая ўдарныя тэмпы, тэрмінова павінна зьнішчыць ураўнілаўку

Давесьці да кожнага камунара плян уборачных работ

...амуна «Прагрэс» выконвае ...даванае заданьне па ўборцы ў ...ечаны тэрмін. Дзякуючы ...раму кіраўніцтву з боку ...тыйнай і камсамольскай ар...зацыі і самой масы камуна... правільнай растаноўцы сіл, ...жаць скончана датэрмінова. ...18 ліпеня ўбрана плошчы ...га і на 20 ліпеня здаюць ...жаве 67 тон сена.

...плян работы ёсьць на ўвесь ...рачны пэрыяд, але плян ра... не даведзен да кожнай ...гады. Праўленьню камуны ...ба зьвярнуць самую сур'ёз... ўвагу на тое, каб плян ...ты давесьці да кожнай ...гады, да кожнага камунара. ...ніязванае сацспаборніцтва ...арніцтва дае свае вынікі. ...ошыя камуны т. **Маханоўскі** ...ачае, што жаночыя ўдар... брыгады даюць эфэктыў...ць па ўсіх паказальніках ...ных работ. Частка жанчын ...ечаны к прэм'яваньню.

...раполка праходзіла сваеча... Праполка карняплодаў вытваралася два разы. Абязьлічка ў камуне ў асноўным зьнішчана. Кожны камунар і калгасьнік прымацаван к вызначанаму інвэнтару, а таксама і плошчы і ўсё гэта дае добрыя вынікі, паломкі і псота коняй спынілася. Трэба адзначыць, што ўраўнілаўка ў **камуне пакуль ня зьнішчана, няма яшчэ дакладнага ўліку працы, як па колькасьці, так і па якасьці работ.** Старшыня камуны тлумачыць гэта непасьпяваемасьцю палявода, слабым разьвіцьцём брыгадзіраў, а таксама і тым, што гэта зьяўляецца новым мэтадам у сельскай гаспадарцы. Такое становішча інакш як не разуменьнем і недаацэнкай усёй важнасьці зьдзельшчыны нельга тлумачыць. Трэба сельсавету, партыйным і камсамольскім арганізацыям зьвярнуць самую сур'ёзную ўвагу на зьнішчэньне ўраўнілаўкі. Тэрмінова давесьці плян уборкі да кожнага камунара.

Шлапакоў.

Выконваюць сваю пастанову

...чсклад і байцы 3-га раёну ...ы МББ чыгункі з энтузі...м падхапілі прапанову ...ндваньня—арганізаваць па... у свой падшэфны калгас ...язда». Байцы на агульным ...зе пастанавілі скарыстаць ...свае дні адпачынку на працы ў калгасе. Яны гэта цьвёрда выконваюць. Кожны ўжо скарыстаў па два дні на працу ў калгасе, а некаторыя адпрацавалі і па тры дні. Праца з боку байцоў праходзіць ударна; калгас з уборачнай кампаніяй справіцца.

Мажэйка.

Байцы дапамаглі

...амуна «Іскра Ленінская» ...шчырую падзяку байцам ...палку ў колькасьці 84 чал., ...аваўшым 16-га ліпеня ў ка...е. Байцы адразу пасьля пры... на работу аб'явілі сябе ...нікамі і выклікалі на сац...орніцтва камунараў. Каму... выклік чырвоных байцоў ...няла і працавала разам з ...вонай арміяй у адной бры...е. Выработка дайшла да паўтара працадні на кожнага работніка.

Байцы сваім прыкладам паказалі, як трэба працаваць паударнаму і што яны зьяўляюцца прыкладнымі змагарамі ня толькі на фронце вайсковым, але і на фронце працоўным. Байцы абяцалі камунарам і ў далейшым дапамагаць у іх працы.

Дзехцяроў.

Дэкада дапамогі грамадзянскай авіацыі

Чыгуначнікі і фанэршчыкі

МАРЫНУЮЦЬ ВЫКЛІК МЭТПРОМАЎЦАЎ

Зараз-жа вызначыць практычныя мерапрыемствы па дапамозе разьвіцьцю грамадзянскага паветранага флёту

Ф-ка Лекерта, фанэрны і лесзавод ня ўключыліся ў дэкаднік

Да сканчэньня дэкадніка дапамогі грамадзянскаму паветранаму флёту засталося некалькі дзён. Прадпрыемствы, падышоўшыя да гэтага пытаньня сур'ёзна, ацаніўшы палітычнае значэньне дэкадніка ў справе разьвіцьця грамадзянскай авіацыі—тэрмінова разгарнулі растлумачальную працу і дабіліся значных вынікаў (завод «Чырвоны мэталіст», будаўнікі ангара пры грамадзянскай школе лётнікаў і г. д.). Але некаторыя прадпрыемствы недаацанілі значэньня дэкадніка (фабрыка Лекерта, фанэрны завод, лесзавод), дзе дагэтуль пытаньне дэкадніка не абгаварвалася на партыйных, камсамольскіх і рабочых сходах, што бязумоўна зьяўляецца апартуністычнай недаацэнкай разьвіцьця грамадзянскага паветранага флёту, на неабходнасьць разьвіцьця якога нам паказаў чэрвеньскі пленум ЦК УсеКП(б).

Многія прадпрыемствы толькі зараз прыступаюць да абгаварэньня гэтага пытаньня (акулярная фабрыка). У выніку такой „работы" некаторыя прадпрыемствы і ўстановы гораду ня прымаюць удзел у правядзеньні дэкадніка разьвіцьця грамадзянскай авіацыі.

Зусім бязьдзейнічаюць арганізацыі чыгункі, якія нават і ня думаюць абгаварваць пытаньне дэкадніка і адказаць на выклік рабочых «Чырвонага мэталіста».

Гаркому партыі трэба праверыць, як партыйныя калектывы, ячэйкі выконваюць яго пастанову аб уключэньні ў дэкаднік.

Чыгуначнікі і Фанэршчыкі,—мэтпромаўцы вам прад'яўляюць рахунак

Рабочыя заводу „Чырвоны мэталіст" першымі адгукнуліся на выклік электразаводцаў Масквы аб правядзеньні дэкадніка разьвіцьця грамадзянскай авіацыі і ў адказ на выклік адлічылі аднадзённы заробак у фонд пабудовы ангару пры грамадзянскай школе лётнікаў імя т. Варашылава. Выкліканыя рабочымі заводу «Чырвоны мэталіст» прадпрыемствы—„Сьцяг індустрыялізацыі", акулярная фабрыка—адказалі мэтпромаўцам і таксама адлічылі аднадзённы заробак. Аднак, рабочыя МББ чыгункі і фанэрнага заводу мэтпромаўцам не адказалі. Гэта трэба тлумачыць толькі тым, што партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі гэтых прадпрыемстваў не завастрылі пытаньне аб дэкадніку сярод рабочых і, як вынік, рабочыя чыгуначнікі і фанэршчыкі яшчэ ў запазычанасьці ў мэтпромаўцаў.

Рабочыя чыгуначнікі і фанэршчыкі,—мэтпромаўцы чакаюць вашага адказу.

Рабочы.

Рабочыя і работніцы «Чырвонага мэталіста», „Сьцягу індустрыялізацыі", панчошнай і курсанты авіашколы, за вамі слова

У справе дапамогі грамадзянскаму паветранаму флёту дагэтуль ганебна нічога ня робяць чыгуначнікі ТДАвіахэмаўская арганізацыя МББ чыгункі зусім не зьвярнула ўвагі на рашэньне чэрвеньскага пленуму. Гэтакае становішча зусім недапушчальна.

«Віцебскі пралетары» выклікае рабочых «Чырвонага мэталіста», «Сьцягу індустрыялізацыі», панчошнай фабрыкі і курсантаў авіашколы імя Варашылава, як перадавікоў у справе практычнае дапамогі грамадзянскае авіацыі Віцебску, стварыць сумесную брыгаду для праверкі работы МББ чыгункі ў гэтай галіне і ў справе правядзеньня дня 1-га жніўня і ТДАвіахэмаўскай работы наогул.

Пазыка „3-га рашаючага"

Старасельскі сельсавет ганебна адстае

Мабілізацыяй увагі ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў вакол ударнага дэкадніка дабіцца поўнага ахопу падпіскай сацыялістычнага і індывідуальнага сэктару

У штурмавы ўдарны дэкаднік поўнасьцю рэалізаваць пазыку на вёсцы

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра рэалізацыю пазыкі „3-га рашаючага году пяцігодкі" на вёсцы

Выслухаўшы даклад аб рэалізацыі пазыкі «3-га рашаючага году пяцігодкі» на вёсцы, Савет Народных Камісараў БССР адзначае вельмі марудны ход рэалізацыі пазыкі на вёсцы (на 15-е ліпеня рэалізавана 1 960 тыс. руб. альбо 12 проц., у калгасах—47 проц., а ў аднаасобным сэктары—0,8 проц.), што пагражае расьцягваньнем кампаніі па рэалізацыі пазыкі.

Раённыя выканаўчыя камітэты і Белкалгасцэнтр да гэтага часу не забясьпечылі сапраўдных бальшавіцкіх тэмпаў рэалізацыі пазыкі сярод калгасьнікаў.

Большасьць раённых выканаўчых камітэтаў недаацаніла ролі аднаасобнага сэктару ў справе рэалізацыі пазыкі.

Бяручы пад увагу паказанае вышэй і неабходнасьць бязумоўнага заканчэньня кампаніі па рэалізацыі пазыкі на вёсцы ў ліпені м цы, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты мабілізаваць усю грамадзкасьць на правядзеньне кампаніі рэалізацыі пазыкі на вёсцы і асабліва сярод індывідуальнага сэктару з тым, каб да 1-га жніўня поўнасьцю было выканана заданьне.

2. Даручыць Белкалгасцэнтру зараз-жа даць катэгарычнае паказаньне раённым калгассаюзам узмацніць рэалізацыю пазыкі сярод калгасьнікаў, дабіўшыся поўнага ахопу іх падпіскаю ў разьмеры ня менш трохтыдневага даходу кожнага калгасьніка, а тым калгасам, якія скончылі ў сябе падпіску, вылучыць ударныя брыгады для правядзеньня рэалізацыі пазыкі сярод індывідуальнага сэктару і адстаючых калгасаў, узяўшы іх на грамадзкі буксір.

3. Адзначаючы поўную бязьдзейнасьць машына-трактарных станцый у справе рэалізацыі пазыкі на вёсцы і накіраваньне належным чынам гэтаю работаю Беларускім Аддзяленьнем Трактарацэнтру, прапанаваць Беларускаму Аддзяленьню Трактарацэнтру ўжыць усе захады да актывізацыі машына-трактарных станцый у справе рэалізацыі пазыкі, дамагаючыся, каб у гэтай рабоце актыўна ўдзельнічалі ўсе работнікі машына-трактарных станцый.

4. Для больш хуткага заканчэньня кампаніі рэалізацыі пазыкі на вёсцы, абвясьціць з 20 ліпеня г. г. штурмавы ўдарны дэкаднік рэалізацыі пазыкі на вёсцы, у сувязі з тым даручыць усім упаўнаважаным цэнтральных устаноў, якія зараз працуюць у раёнах па іншых кампаніях, уключыцца на час ўдарнага дэкадніка ў работу па рэалізацыі пазыкі. Абавязаць раённыя выканаўчыя камітэты маблізаваць на гэтую работу ўвесь актыў раёну і сельскіх саветаў.

5. Адзначаючы слабае асьвятленьне ў друку ходу кампаніі па рэалізацыі пазыкі, абавязаць цэнтральныя і мясцовыя газэты наладзіць сыстэматычнае асьвятленьне ходу кампаніі рэалізацыі пазыкі на вёсцы, падцягваючы адсталыя раёны і пераносячы прыклады лепшай работы перадавых раёнаў у практыку работы іншых раёнаў.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР К. **Бэнэм.**
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР **С. Кандыбовіч.**
18 ліпеня 1931 г., г. Менск.

Дабіцца поўнага ахопу падпіскай усіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў

Савет Народных Камісараў БССР у сваёй пастанове аб ходзе рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы год пяцігодкі» на вёсцы канстатаваў вельмі марудны ход падпіскі на вёсцы, як па калгасах, так і асабліва па індывідуальным сэктары. Пастанова падкрэсьлівае, што такое становішча тлумачыцца тым, што большасьць раённых выканаўчых камітэтаў недаацанілі ролі аднаасобнага сэктару ў справе рэалізацыі пазыкі.

Як-жа абстаіць справа ў прыгарадных сельсаветах Віцебшчыны? Становішча зусім нездавальняючае. Шэраг сельсаветаў ганебна плятуцца ў хвасьце і калі па ахопу пазыкай калгасаў маецца некаторы зрух, то ў рэалізацыі пазыкі сярод аднаасобнікаў няма яшчэ належных тэмпаў. Прыкладам гэтага можа служыць **Бабініцкі** сельсавет (аб якім мы ўчора пісалі), што ён з сумы 6480 р. сярод аднаасобнікаў рэалізаваў пазыку на 15 р. Адстае **Старасельскі** сельсавет, **Ялагінскі, Даўжанскі** і інш.

Тлумачыць такое становішча трэба толькі тым, што на мясцох некаторыя партыйныя і камсамольскія ячэйкі, камісіі садзейнічаньня і сельсаветы апартуністычна адносяцца да справы правядзеньня ўдарнага дэкадніка і як сьлед працу ў гэтай галіне не разгарнулі; значэньне пазыкі не папулярызуюць сярод калгасьнікаў і асабліва сярод аднаасобнікаў.

Трэба пераключыцца на ўдарныя тэмпы работы і да 1-га жніўня дабіцца 100 проц. ахопу ўсіх калгасьнікаў і аднаасобнікаў пазыкай «Трэці рашаючы год пяцігодкі».

Парт'ячэйка—з боку ад падпіскі

Партыйная ячэйка Віцебскага сельсавету праходзіць міма пытаньня рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы год пяцігодкі». Дагэтуль пытаньне аб распаўсюджваньні пазыкі не абгаварвалася на партыйным сходзе.

Сельсавет за апошні час пачаў разгортваць некаторую работу. На сходзе актыву было завострана пытаньне аб распаўсюджваньні пазыкі і ўвесь сельскі актыў мабілізаван на правядзеньне падпіскі. Усё-ж на сёньняшні дзень падпіскай яшчэ ня ўсе ахоплены (сума падпіскі па калгаснаму і аднаасобнаму сэктару складае 8.000 руб.).

Брыгадзір.

Старасельскі сельсавет бязьдзейнічае

Разьмяшчэньне пазыкі «Трэці рашаючы год пяцігодкі» сярод насельніцтва Старасельскага сельсавету ідзе вельмі марудна. Некаторыя арганізацыі зусім ня прымаюць удзел у распаўсюджваньні пазыкі (Захадлес, Лесбел, спажывецкая кааперацыя). Мясцкому сельпо было дадзена заданьне распаўсюджыць пазыкі сярод насельніцтва на 1000 р., заданьне на 24 ліпеня выканана толькі на 23 проц. Сельсавет з боку ад падпіскі. У малочнай арцелі і калгасе „1-га мая" рэалізацыя пазыкі ідзе шпаркім тэмпам.

Трэба мабілізаваць усе сілы на сканчэньне падпіскі на пазыку і поўны ахоп усяго насельніцтва да 1-га жніўня.

Пламенны і Прамень.

ПЕРШЫ ДЗЕНЬ ТЫРАЖУ ПАЗЫКІ „ПЯЦІГОДКА У ЧАТЫРЫ ГАДЫ"

У выніку спаборніцтва трох чалябінскіх волатаў па разьмяшчэньні пазыкі трактарабуду, фэрросплава і Чгрэс—першае месца падзелена паміж Чгрэс і фэрросплавам. Адкрыцьцё тыражу азнаменавалася мітынгамі адначасова на абодвух прадпрыемствах. Рабочыя фэрросплаву парашылі правесьці суботнік, перадаўшы ўвесь заробак на мэты пазыкі. Чгрэсаўцы, перавыканаўшыя ўжо плян падпіскі, не застанавіліся на посьпехах і пастанавілі дабіцца пагалоўнага ахопу рабочых пазыкай.

Зараз на тыраж у Чэлябінск прыбыла звыш 100 дэлегатаў ад буйнейшых прамысловых раёнаў Саюзу. Горад прыняў сьвятчны выгляд. Дамы і вуліцы ўкрашаны лёзунгамі, плякатамі і макетамі, што характарызуюць пазыковыя работы. 25 ліпеня пры ўдзеле некалькіх тысяч пралетарыяў Чэлябінску пачала работу тыражная камісія. Першыя выйгрышы ў 200 руб. палі на аблігацыі №№ 038345, 013910, 043064, 006769, 045526.

25-тысячнікі—на перадавыя пасты

УсеЦСПС за подпісам тав. **Анціловіча** зьвярнуўся з адозвай да 25-тысячнікаў, у зьвязку з адозвай рабочых шэрагу маскоўскіх заводаў аб рэалізацыі пазыкі на вёсцы. «Важнейшая роля ў справе пасьпяховага разьмяшчэньня пазыкі на вёсцы—гаворыцца ў адозве—належыць 25-тысячнікам. 25 тысячнікі павінны стаць перадавымі арганізатарамі кампаніі на сяле і забясьпечыць яе правядзеньне такімі-ж баявымі тэмпамі, як яна праведзена ў горадзе. Рабочая кляса пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, пасьпяхова выконваючая задачы сацыялістычнага будаўніцтва, ажыцьцяўляючы сваю вядучую ролю, дапамагае, разам з тым, калгасным і бядняцка-серадняцкім масам у іх барацьбе за хутчэйшае ажыцьцяўленьне задач сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, завяршэньня суцэльнай калектывізацыі і ліквідацыі кулацтва як клясы. Хуткім разьмяшчэньнем пазыкі забясьпечым выкананьне адзінага фінпляну».

За злачынства—да адказнасьці

Загадчык рахункаводных курсаў сампрамсаюзу **Вінец** на неаднаразовыя заявы курсантаў аб неабходнасьці ўтрыманьня грошай на пазыку „Пяцігодка ў чатыры гады", адмаўляецца, матывуючы гэта тым, што ён ня можа займацца грашовай «цяганінай» і інш. Калі курсанты самі наладзілі ўтрыманьне грошай на пазыку, Вінец наўмысьля пачаў выдаваць буйныя грошы і гэтым зноў сарваў утрыманьне. **Вінец** займаецца шкоднымі справамі. Ён сьвядома затрымлівае афармленьне пазыкі.

Трэба ў самым хуткім часе справу высьвятліць і прыцягнуць да адказнасьці Вінецава яго злачынныя справы.

Вожык.

Пасяджэньне прэзыдыуму гарсавету на шчацінай ф-цы

Сёньня, а 7 гадз увечары, пасяджэньне прэзыдыуму гарсавету адбудзецца на шчацінай ф-цы.

Абвестка дню:

Ход будаўніцтва шчацінага камбінату і становішча жыльлёвага будаўніцтва камбінату.

Прэзыдыум зварачаецца да фабзаўмясцкомаў шчацінай, шчотачнай і валасапрядзільнай ф-к забясьпечыць яўку рабочых.

На 20 ліпеня калектывізавана 14.057.300 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак

Рэгулярны запіс працадзён вытвараюць 43,4% калгасаў

МАСКВА, 25. На 20 ліпеня па СССР калектывізавана 14.057.300 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак—57,1 проц. агульнай колькасьці гаспадарак за папярэднюю дэкаду. На 20-е ліпеня зьдзельшчына праведзена толькі на 53,9 проц., запіс працадзён—на 43,4 проц. Працоўныя кніжкі атрымалі толькі 65,6 проц.

Уступленьне ў уборачную кампанію абавязвае калгасы ўзмацніць пераход на зьдзельшчыну і ўстанавіць на працягу бліжэйшых дзён рэгулярную запіс працадзён.

Зьдзельшчыну—ў гародныя гаспадаркі

МАСКВА, 26. У бліжэйшую дэкаду разгарнецца ўборка гародніны. Уборка ў значнай ступені залежыць ад правільнай арганізацыі працы. Між тым у большасьці гародных гаспадарак пануе абязьлічка і ўраўнілаўка. У радзе раёнаў сарвана прапалачная работа.

Прэзыдыум ЦК саюзу рабочых земляробчых саўгасаў абвясьціў з 25 ліпеня па 5 жніўня дэкаднік па ўкараненьні зьдзельшчыны і пастаноўкі вучоту працы ў гародных гаспадарках.

Жылбудаўніцтва павялічваецца больш як у два разы

МАСКВА, 26. У бягучым годзе ў жылбудаўніцтва па ўсяму СССР укладваецца 1.215 млн. р., на 110 проц. больш як у мінулым годзе. Выкананьне пляну жылбудаўніцтва дасьць жыльлёвай плошчы для 2.300 тысяч працоўных.

Пабудова заводу горнага абсталяваньня ў Кузбасе

У Кузбасе пачата падрыхтоўчая работа па будаўніцтву новага мэханічнага заводу, які будзе вырабляць горнае абсталяваньне і выпускаць рамонтныя часткі мэханізмаў. Завод агульнай каштоўнасьцю ў 5 млн. руб., будзе пабудаваны ў раёне Кізялоўскага рудняка.

Ордэн працоўнага Чырвонага сьцягу за пасьпяховае выкананьне пляну

БАКУ, 26. За пасьпяховае выкананьне вытворчых плянаў, дасягнутых дзякуючы выключнай арганізаванасьці і энтузіязму рабочых, пераважна цюрак, СНК СССР пастанавіў узнагародзіць швэйную фабрыку № 4 імя Алі-Байрамава ордэнам працоўнага Чырвонага сьцягу.

Францускім тэкстыльшчыкам здрадзілі

ПАРЫЖ, 25. Прадстаўнікі тэкстыльных прадпрыемстваў Алуэна, Вэрвіка і Коміна і згодніцкі прафсаюз падпісалі згоду аб аднаўленьні работы ва ўмовах зьніжэньня зарплаты на 4 проц.

Барацьба амэрыканскіх тэкстыльшчыкаў

НЬЮ-ЁРК, 25. У Поўцехеце (штат Род Айленд) адбылася дэманстрацыя 1500 рэвалюцыйных тэкстыльшчыкаў. Дэманстранты былі зьбіты паліцыяй і рассеяны. Рэвалюцыйны прафсаюз тэкстыльшчыкаў зараз кіруе забастоўкай 16.000 тэкстыльшчыкаў.

Міжнародная хроніка

НЬЮ-ЁРК, 25. У Сант-Яга (сталіцы рэспублікі Чылі) пры разгоне дэманстрацыі рабочых і студэнтаў забіта некалькі чалавек і ранена некалькі сот. Па ўсёй краіне адбываюцца сутычкі паміж войскамі і рабочымі.

БЭРЛІН, 26. Бэрлінскі паліцэйскі прэзыдэнт с.-д. Гржэзінскі забараніў прызначаную на 1 жніўня антываенную дэманстрацыю.

ПАРЫЖ, 25. Учора з Лёндану ў Парыж дастаўлена золата на 166 млн. франкаў.

ДАЦЬ НЯ МЕНШ 7000 ПАДПІШЧЫКАЎ НА ЦО „ПРАВДА"

Усім парткалектывам і ячэйкам КП(б)Б.

Падпіска на газэту «Праўда» зрываецца: замест 7000 маецца 3000 падпішчыкаў. Гарком КП(б)Б прапануе выканаць кантрольна-тыражнае заданьне. Разгарнеце працу па штурму на падставе пастановы сакратарыяту Гаркому КП(б)Б ад 21 ліпеня 1931 г.

Гарком КП(б)Б.

Сёньня гарадзкая канфэрэнцыя фізкультурнікаў

Гарадзкая арганізацыя фізкультурнікаў за час першай канфэрэнцыі мае вялікія дасягненьні ў сваёй працы. За гэты час арганізавана цэлы шэраг гурткоў на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах, арганізаван вэлёпрабег, мэтай якога была дапамога саўгасам і калгасам арганізаваць працу па ўборачнай кампаніі, абмен вопытам з другімі прадпрыемствамі Беларусі.

Фізкультурнікі вузла МББ у падарунак канфэрэнцыі выпускаюць з рамонту паравоз, адрамантаваны не ў рабочыя гадзіны. Фізкультурнікі фабрыкі «Сьцяг індустрыялізацыі» перадалі 17 лепшых ударнікаў у шэрагі камсамолу. 25 ліпеня быў праведзен суботнік фізкультурнікаў па дапамозе правядзеньня праполкі, на які зьявілася 300 фізкультурнікаў.

Разам з дасягненьнямі маюцца і недахопы. Недастатковая дапамога і кіраўніцтва з боку фабкомаў. На некаторых прадпрыемствах фізкультурная праца яшчэ не пачата. Маецца недаацэнка фізкультуры. Характэрным могуць служыць адносіны адміністрацыі фкі «Сьцяг індустрыялізацыі» да фізкультурнікаў, якія арганізавалі ўдарную брыгаду ў колькасьці 13 асоб імя 10-годзьдзя Спортінтэрну і ўзялі абавязак выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну. Адміністрацыя тармазіла перавод гэтых 13 фізкультурнікаў у адну зьмену.

Адкрываючаяся сёньня канфэрэнцыя павінна абгаварыць пытаньні перабудовы фізкультурнай працы па вытворчаму прынцыпу ахопу фізкультурнікаў ленінскім камсамолам. Фізкультурную работу трэба перабудаваць у адпаведнасьці з задачамі трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

М.

Фізкультурны зорны прабег

1-га жніўня фізкультурныя арганізацыі Віцебску наладжваюць прапагандысцкі зорны прабег па гораду, прысьвечаны міжнароднаму чырвонаму дню 1-га жніўня.

Маршрут:

1. Вагзал—Пляц Волі.
2. Чырвоная плошча (выпраўдом)—«Плошча Волі».
3. Магілёўская плошча.

а) На 1-ы зборны пункт—Вакзальная плошча падыходзяць арганізацыі: ф-ка «Дзьвіна», лесзаводы, фанэрны завод, фізкультурныя курсы, мэталісты, МББ і 39-ы атрад харчавікоў.

б) На другі зборны пункт—Чырвоная плошча (выпраўдом) падыходзяць арганізацыі: краўцы, вайсковыя з лягеру, сампрамсаюз, нарсувязь, будаўнікі і саўгандслужачыя.

в) На трэці зборны пункт (Магілёўская плошча) падыходзяць арганізацыі: фабрыка імя Клары Цэткін, скурнікі, ФЗВ краўцоў, «Дынамо», рабпрос і нархарч.

Увага. Да кожнага зборнага пункту паказаныя фізкультурныя арганізацыі зьбіраюцца да 5 гадз. увечары палітычна і мастацка аформленымі.

Адказныя за пункты: за першы—**Рутэмберг**, за другі—**Патоцкі**, за трэці—**Філіпецкі**.

Старт роўна а 6-й гадз. увечары.

Пасьля фінішу арганізавана ідуць на водную станцыю, дзе будзе масавая здача на значок па грэблі і плаваньні, а таксама масавае катаньне на чоўнах, г. зн. выкананьне праграмы раней разасланай воднай станцыяй. Кожная арганізацыя выстаўляе ня менш 10 чал. у процівагазах.

Віцебскі гарсавет фізкультуры.

Да ведама дэлегатаў канфэрэнцыі

Сёньня, 28-га ліпеня, а 6-й гадзіне ўвечары, у садзе Леніна адкрываецца другая агульнагарадзкая прафсаюзная канфэрэнцыя фізкультурнікаў.

Яўка дэлегатаў абавязкова і без спазьненьня.

Здаць парожнюю тару

Пастанова прэзыдыуму віцебскага гарадзкога савету ад 25-га ліпеня 1931 г.

У мэтах паслабленьня дэфіцыту ў рагожна-кулявой тары і максымальнага скарыстаньня былых у скарыстаньні рагож, кулей, а таксама мачальнага каната і уціля, прэзыдыум гарадзкога савету, у адпаведнасьці з пастановай Наркамзабесьпячэньня і ВСНГ ад 22 га красавіка 1931 г. за № 230 і Наркамзабесьпячэньня і ВСНГ БССР ад 11-га ліпеня 1931 г. за № 55, **пастанаўляе:**

1. Абавязаць усе дзяржаўныя і грамадзкія прадпрыемствы ўсю апаражняючуюся з-пад тавараў рагожную і кулявую тару, а таксама і мачальную рвань (мачальны канат, уціль) здаваць выключна на рамонтна-кулявую базу і прыймовыя пункты сыстэмы каапэрацыі інвалідаў Белкаапінсаюзу — інваліднай арцелі імя 25 га кастрычніка.

2. Здачы на базы Белкаапінсаюзу—арцелі імя 25-га кастрычніка падлягае ўся апаражніўшаяся рагожна-кулявая тара—не позьней 10 дзённага тэрміну пасьля яе апаражненьня.

3. Здачу і прыёмку быўшай у карыстаньні рагожна-кулявой тары і мачальнай рвані на рамонтную базу вытвараць у адпаведнасьці з катэгорыямі па цэнах і ў парадку, паказаных у клясыфікацыі і інструкцыі, апублікаваных у «Вестніке» Наркамзабесьпячэньня і ВСНГ СССР ад 22 га красавіка 1931 г. за № 230.

4. Арцелі інвалідаў імя 25 га кастрычніка прыняць меры к пашырэньню рамонтнай базы і нарыхтоўчых пунктаў у горадзе і раёне, маючы на ўвазе неабходнасьць ахопу зборам тары ўсіх спажыўцоў тары, а таксама і сельсаветаў, у якіх асядае тара на мясцох. Асаблівую ўвагу зьвярнуць на збор уціля і адсартаваньне з яго часткі рагож, прыгодных для будаўнічых мэт, а для пашыўкі кулей і поўнай уцілізацыі астатняй часткі мачальнай сыравіны арганізаваць пры рамонтнай базе арцелі інвалідаў імя 25-га кастрычніка расчоску апошняй (на мачалу для матрасаў).

5. Саюзтары ў дэкадны тэрмін выпрацаваць норму вучоту рагожа-кулявой тары.

Абавязаць усе арганізацыі, атрымліваючыя тавары ў рагожа-кулявой тары, весьці вучот апошняй.

6. Адрамантаваная на базе каапэрацыі інвалідаў рагожа-кулявая тара разьмяркоўваецца ў цэнтралізаваным парадку Снабаддзелам. Будаўнічая рагожа і тропаная мачала распаўсюджваецца па саюзлеспромах.

7. Дагаворы, заключаныя арганізацыямі, установамі і прадпрыемствамі, падведамственнымі ВСНГБ і Наркамзабесьпячэньню па нарыхтоўцы рагожа-кулявой тары і канатнай рвані (апрача даўмоўленасьці з інваліднай каапэрацыяй) са дня апублікаваньня гэтай пастановы губляюць сваю моц.

8. Агульны нагляд за выкананьнем гэтай пастановы на мясцох ускладаецца на Гарснаб.

Старшыня гарсавету **Каменштэйн.**

Сэкратар **Прапопенка.**

Усім ячэйкам камсамолу

Гаркамол прапануе зараз-жа абгаварыць у ячэйках КСМ і кіравацца паказаньнем ЦК УсеЛКСМ па росту, зьмешчаным у «Камсамольскай Праўдзе» ад 23 ліпеня.

Нарада па правядзеньні міжнароднага чырвонага дню

Сёньня, 28-га ліпеня, а 7 гадзіне ўвечары, у памяшканьні Палацу працы (пакой № 25), адбудзецца нарада старшынь савратароў ячэек Асоавіахэму, старшынь рэдкалегій шматтыражак і насьценгазэт, культпрацаўнікоў фабкомаў, сакратароў ячэек КСМ і ячэек т-ва «Прэч няпісьменнасьць» па пытаньню: 1) аб дэкадніку практычнай дапамогі грамадзянскай авіацыі 2) аб міжнародным чырвоным дні 1-га жніўня і 3) аб двухдэкадніку штурму няпісьменнасьці.

Яўка вышэйпаказаных таварышоў абавязкова.

«Віцебскі Пралетары», Гарпрафсавет, ГК КСМ, гарсавет Асоавіахэму і гарсавет т-ва «Прэч няпісьменнасьць».

Пленум сэкцый гарсавету

29-га ліпеня, а 7 гадз. увечары, адбудуцца пленумы сэкцый гарсавету:

Вайсковай—у Ялагінскім сельсавеце, збор на вуглу Бальнічнай вуліцы, а 6 гадз.

Адміністрацыйна-прававой—у памяшканьні пракуратуры (Замкавая № 24).

Сельскагаспадарчай—у доме «селяніна».

РСІ—у клюбе швэйнікаў.

Камунальнай—у клюбе камунальнікаў.

Працы і забясьпекі—у клюбе саматужнікаў.

Нарасьветы—у доме асьветы.

Аховы здароўя—у клюбе мэдсанпрацы.

Бытавой—у клюбе будаўнікоў.

Каапэрацыйна-гандлёвай—у клюбе «Прафінтэрн».

Грашовай—у памяшканьні гарсавету, пакой № 22.

Прамысловай—у клюбе мэталістых.

Паседжаньне бюро скаргаў

Сёньня, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні РСІ (Замкавая, 26) адбудзецца паседжаньне бюро скаргаў РСІ з наступнай абесткай дню:

1) Справа прадуктовага маг. 26-га куста. Выклікаюцца: заг. 26 га куста, заг. магаз. т. Малочнікаў, пайшчыка Іванова—жых. па 2-й Юр'еўскай № 23. (Дакл. т. Корзін).

2) Справа сталоўкі № 1. Выклікаюцца: заг. сталоўкі № 1, заг. буфэтам—т. Мініна, прадаўшчыца буфэта т. Просекава, рабочы «Прагрэса» Яхнін, члены арц. «Уперад» Кісіна, Аксельрод, Мірская, Іоффе і інш.

3) Справа сталоўкі № 5. Выклікаюцца: заг. сталоўкі № 5, рабочы Шмей—жых. Аршанскае шасэ 9, Гельдзіна ф-ка «Лекерта» і працаўнікі сталоўкі, прадстаўнік ЦРК Гарлёвага аддзелу і грамадзкага харчаваньня.

4) Справа буфэта ТПО на вагзале 1-га кл. Выклікаюцца: заг. буфэтам, рабочы кандуктар Дайхін, член гарсавету Лінда, повар Міхалоўскі, заг. стал. Масьленьнікаў, прадстаўнік праўленьня ТПО чыг.

На гэта паседжаньне вылучаны заседацелямі—раб. голкавай ф-кі Астроўскі і раб. ф-кі «Прагрэс» Бітырына. Запрашаюцца ўсе члены бюро скаргаў, дабрахвотнікі, «ЛК» і дэлегаткі жанадзелу.

Да ведама чырвонагвардзей цаў і чырвоных партызан

1-га жніўня ўсе чырвоныя гвардзейцы і чырвоныя партызаны павінны сабрацца к 4 гадзінам дню ў гарсавеце для ўдзелу ў дэманстрацыі, прысьвечанай Міжнароднаму чырвонаму дню.

Яўка абавязковая ў формах.

Да ведама ячэек ЛКСМ

29-га ліпеня а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні ГК ЛКСМ адбудзецца нарада культпропу ячэек ЛКСМБ. Парадак дню: Аб 17 МЮД.

Яўка абавязкова.

ГК КСМ.

—о—

— Сёньня, 28 ліпеня, а 6 гадзіне увечары, у памяшканьні гарком КП(б)Б (Замкавая 26) склікаецца нарада 3-кутнікаў цагельных заводаў г. Віцебску супольна з ворсаўскім актывам па пытаньню палепшаньня цэглы.

ГарКК—РСІ.

Нам. рэдактара **Н. Баруноў.**

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР
Пач. а 8½ гадз. увеч.
ГАСТРОЛІ ЛЕНІНГРАДЗКАГА ТЭАТРУ ДРАМЫ І КАМЭДЫІ
Апошнія гастролі.
Сёньня, 28-га ліпеня,
Балота
Біл. прад. у касе тэат. з 12—2 і з 5 г.

БЕЛДЗЯРЖКІНО З панядзелка, 27-га ліпеня
СПАРТАК Пачатак 1-га сэансу а 7 г. — Толькі 2 дні: 28 і 29 ліпеня, амэрыканскі фільм **Логуна пэрлаў** у 8 частках.
МАСТАЦКІ Пачатак 1-га сэансу а 7 г. — Толькі 2 дні: 28 і 29 ліпеня, новая замежная камэдыя **ХРЫЗАНТЭМА**
ПРАЛЕТКІНО Пачатак 1-га сэансу а 7 г. — Толькі 2 дні: 28 і 29 ліпеня, **ЗЯЛЁНЫ ЗАВУЛАК**

ЧЫРВОНААРМЕЙСКІ КІНО-ТЭАТР
Толькі 3 дні: сёньня, у аўторак, 28-га, заўтра, у сераду, 29 га, і ў чацьвер, 30-га ліпеня, замежны баявік
Абуджэньне жанчыны
Пачатак 1-га сэансу а 1 гадз. 1036—2—1

Сёньня, у аўторак, 28-га ліпеня, а 8-й гадзіне увечары, у гарклюбе **лесдрэўрабочых** адбудзецца **вялікі вытворчы вечар-пераклічка** па выкананьню прамфінпляну за 2-і квартал 1931 г. лесзаводу № 13, фанэрнага заводу, інструментальна-мэблёвай ф-кі, ф-кі гнутай мэблі, лесзаводу № 3, кіраўніцтва па сплаву і Віцлеспрамгасу.
На абвестку дня: **выкананьне прамфінпляну за 2-і квартал** і што зроблена па прамове т. Сталіна.
Садаклады аб ударніцтве і сац. спаборніцтве.
ФЗМК павінны прыняць захады да 100% яўкі рабочых на гэты вечар.
Прадпрыемства, маючае лепшыя паказальнікі выкананьня прамфінпляну, **атрымоўвае сьцяг—прыз пераходны.**
Пасьля вечару—**вялікая мастацкая частка.**
1030—2—2 **Клюбны арганізатар.**

КАНФЭРЭНЦЫЯ ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ АДКЛАДАЕЦЦА.
Аб часе канфэрэнцыі будзе аб'яўлена дадатково.
К-т Чырвонага крыжу. 1025—3—3

ГАРТЭАТР
Сёньня, у аўторак, 28-га ліпеня,
апошняя гастроль
БАЛЕТА
дзяржтэатру оперы і балету (б. Марыінскі).
ЧЫТАЙЦЕ АФІШЫ.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ
ў ФЗВ пры заводзе „Чырвоны мэталіст"
працягнут да 15-га жніўня.
Заявы прымаюцца непасрэдна ў школе. Да заявы павінны быць прыкладзены наступныя дакументы: аб узросьце, аб адукацыі, аб сацыяльным і матар'яльным становішчы бацькоў, як зараз, так і да рэвалюцыі. Узрост прыймаемых ад 15½ да 18 год. Адукацыя: 7, 6 і 5 груп сямігодкі, прычым падаючыя заявы з 5 і 6 груп павінны прадставіць справкі ад школ сацвыху аб тым, што школа не супярэчыць супроць яго паступленьня ў ФЗВ, без чаго заявы прымацца ня будуць.
Спэцыяльнасьці: слесары, токары, ліцейшчыкі, кавалі, мадэльшчыкі.
Загадчык школай **Лев.**
1010—3—3

ВІЦЕБСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ
Дзяржбанку,
у зьвязку з паступленьнем лімітаў на 3-і квартал, даводзіць да ведама кліентуры, што для адчыненьня крэдытаў на 3-і квартал 1931 года неабходна зараз-жа прадставіць аддзяленьню Дзяржбанку:
1) Зацьверджаны аб'яднаньнем фінплян на 3-і квартал і плянавы баланс, увязаны з лімітам і фінплянам.
2) Рэестр дагавароў на 3-і квартал, забясьпечваючых снабжэньне і збыт па фінпляну, а таксама копіі дагавароў.
Дагаворы павінны быць канкрэтнымі і мець азначаныя рэквізіты: колькасьць пастаўляемай прадукцыі, якасьць, цэны, тэрміны пастаўкі ў месяцох, парадак разьлікаў, матарыяльная адказнасьць за невыкананьне.
Недагруз за 2-і квартал, пераходзячы выкананьнем на 3-і квартал, можа быць прынят у лік снабжэньня і збыту толькі пры ўмове належнага і канкрэтнага падцьверджаньня з боку пастаўшчыкоў пераносу недагрузу на 3-і квартал, з указаньнем колькасьці, каштоўнасьці паставак і тэрміну.
Непрадстаўленьне пералічаных дадзеных пацягне за сабой зачыненьне крэдыту, а прадстаўленьне дэфэктыўных дагавароў—адпаведнае зьмяншэньне крэдытаў супроць лімітаў.
ДЗЯРЖАЎНЫ БАНК Віцебскае аддзяленьне.
1037—2—1

Друкарні „Камінтэрн" ПАТРАБУЮЦЦА
для кваліфікацыі на наборшчыкаў
падлётні ад 18 год, маючыя адукацыю ня мінэй 6—7 клясаў.
Жадаючыя могуць наведацца ў друкарні: Бальшавіцкая, 10, ад 8 гадз. раніцы да 5 гадз. дню.
Адміністрацыя.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ
БУДАЎНІЧЫ І ЭНЭРГЕТЫЧНЫ ІНСТЫТУТЫ
абвяшчаюць **восенкы прыём на 1-ы курс.**
Па будаўнічаму інстытуту:
на аддзяленьні: а) прамысловага (фабрычна-заводзкага) будаўніцтва, б) агро індустрыяльнага, в) жыльлёвага і грамадзянскага, г) апалу і вэнтыляцыі і д) дарожнае—у агульнай колькасьці—150 асоб;
на вечэрняе аддзяленьне (курсы) па пэракваліф'кацыі тэхнікаў у інжэнэры—60 асоб.
Па энэргетычнаму інстытуту:
на аддзяленьні: а) прамысловай (фабрычна-заводзкай) электрыфікацыі, б) сельска-гаспадарчай электрыфікацыі, в) цэнтральных электрычных станцый з цёплатэхнічным ухілам і г) высокавольтных перадач—у агульнай колькасьці—125 асоб.
Жадаючыя паступіць павінны падаць на імя дырэктара інстытуту заяву з далучэньнем дакумантаў, патрабуемых правіламі прыёму ў ВТНУ і паказаць на якім аддзяленьні жадаюць вучыцца.
Заявы з дакумантамі прымаюцца да 10-га жніўня у канцалярыі інстытутаў: г. Менск, рог Чырвоноармейскай і Унівэрсытэцкай, № 42/8.
Іспыты праводзяцца з 15-га па 20-е жніўня.
Падрабязныя правілы прыёму ў інстытуты надрукаваны ў газэце «Рабочий» ад 10-га гэтага ліпеня, № 160, у газэце «Зьвязда» ад 14-га гэтага ліпеня № 188, і ў газэце «Савецкая Беларусь» ад 16-га гэтага ліпеня № 161.
Адначасова праводзіцца прыём на ўсе курсы дзённага і вячэрняга рабфаку, згодна правіл прыёму на рабфакі.
1034—1—1 **Дырэкцыя Інстытуту.**

Аб'ява
Згодна пастановы міжведамственнай нарады пры Саюзтрансе, **прапануецца ўсім установам і прадпрыемствам,** што заключылі дагавары з віцебскай канторай Саюзтрансу на вытварэньне транспартна-экспэдыцыйных апэрацый, у пяцідзённы тэрмін, **не позьней 29-га ліпеня, прадставіць Саюзтрансу зьвесткі аб грузазвароце на пэрыяд восенна-зімовых перавозак,** г. зн. з 1-га жніўня па 31-га сьнежня г. г. паасобна за кожны месяц па прыбыцьці і адпраўленьні з пералічэньнем роду грузаў.
Установы і прадпрыемствы, якія не прадставяць паказаных вышэй зьвестак, будуць пазбаўлены права карыстацца нашым аўта-гужтранспартам на пэрыяд восенна-зімовых перавозак.
Кіраўнік віцебскай канторы Саюзтрансу **Рафаловіч.**
№ 1017—3—3

ВІЦЕБСКІ ВЯЧЭРНІ РАБОЧЫ УНІВЭРСТЫТЭТ
Адчыняе восенны прыём на 1-ы курс унівэрсытэту. Прымаюцца выключна рабочыя з фабрычна-заводзкіх прадпрыемстваў з 3-гадовым рабочым стажам, першапачатковай адукацыяй (2—3 першыя групы школы, ці хатняя самаадукацыя).
Заявы прымаюцца да 25-га жніўня г. г., у канцэлярыі ўнівэрсытэту (Валадарская вул., д. № 27/6), у памяшканьні **маапэрацыйнага тэхнікуму, 2-гі паверх, пакой № 4,** штодзённа (за выключэньнем выходных дзён: 5, 10, 15, 20, 25 і 30), з 6 да 8 гадз. увеч.
К заявам неабходна прылажыць наступныя дакументы:
а) Пасьведчаньне з месца працы і папярэднім рабочым стажам.
б) Даведка аб сацыяльным становішчы бацькоў.
в) Анкета, засьведчаная фабзаўкомам.
Анкеты і даведкі аб паступленьні магчыма атрымаць у канцэлярыі унівэрсытэту.
Курс навучаньня 2½ гады (5 сямэстраў).
З 1-га курсу, апрача агульна адукацыйных дысцыплін, пачынаецца разьбіўка на цыклы па спэцыяльнасьцям. Намячаюцца наступныя цыклы: 1) мэханічны, 2) электра-тэхнічны, 3) адміністрацыйна-гаспадарчы, 4) каапэрацыйны і 5) прафрух.
1013—3—3

Даводзіцца да ведама ўстаноў і насельніцтва г. Віцебску аб тым, што **КАМТРЭСТАМ вытвараецца продаж** за наяўны разрахунак:
1) **Абанентных адрыўных білетаў па трамваю:** па намінальнай цане—10 кап. білет, без абмежаваньня колькасьці.
2) **Абанэнтных трамвайных картак** на розны час па цане: з уваходам праз пярэднюю пляцоўку—18 руб. у месяц, без права ўваходу праз пярэднюю пляцоўку—15 руб. у месяц.
3) **Абанементных адрыўных білетаў па лазьням** па намінальнай каштоўнасьці:
1-я кляса 30 кап.
2-я » 20 »
Ільготным тарыфам па вышэйпаказаным прадпрыемствам карыстаюцца:
ПА ТРАМВАЮ:
выключна рабочыя па сьпісах ФЗМК з паказаньнем адрасаў, з выдачай па 50 білетаў кожнаму на месяц, па цане 6 кап. білет.
ПА ЛАЗЬНЯМ:
Ваенвед, студэнцтва, атрымліваючае стыпэндыю і інваліды вайны праз страхкасу, па заяўкам арганізацый па цане:
1-я кляса 20 кап.
2-я » 10 »
Продаж усіх ільготных білетаў будзе вытвараецца з 1-га па 10-е кожнага месяцу.
Продаж білетаў па намінальнай каштоўнасьці будзе вытвараецца штодзённа з 10 гадз. раніцы да 4-х гадз. дню, за выключэньнем выходных дзён, у памяшканьні к-ры Віцкамтрэсту (пляц Волі, 1/2).
ВІЦКАМТРЭСТ.
984—5—3

Кошт публікацыі аб згубе аднаго дакумэнту 1 руб.

Сёньня, у аўторак, 28-га ліпеня, а 8 гадзін увеч., у пам. дому асьветы, склікаецца **агульны сход асьветнікаў,** якія знаходзяцца ў горадзе.
З прычыны важнасьці пытаньняў, яўка абавязкова.
Старшыня праўленьня саюзу працасьветы
1033—2—2 **Веранава.**

Групком № 2 саюзу будаўнікоў паведамляе, што, згодна новай рэарганізацыі, ён з гэтага ліку будзе лічыцца **групком № 23 (у ўсебеларускім маштабе) саюзу прамысловага і камунальна-жыльлёвага будаўніцтва.**
1038—1—1

ПРАДАЕЦЦА ЖАНОЧЫ ВЕЛЕСЫПЭД
Адрас: Чырвоная плошча, 9/2, Лугоўская.
1035—1—1

МЯНЯЮ КВАТЭРУ
ў Віцебску з усімі ўдобствамі, у цэнтры гораду, **на такую-ж кватэру ў Менску.** З прапановамі зварочвацца: Менск, Школьная, д. № 6, кв. 1, Казінік. 961—6—6

Віцгарліт № 1. Друкарня «Камінтэрн», Бальшавіцкая, 10. Тыраж 10.000